© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№19 (309) 8 — 14 траўня 2003г. Наклад 11.500 экз. Кошт 400 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

ДАЖДЖЛІВЫ ПЕРШАМАЙ



На першамайскім мітынгу людзі чакалі нечага большага...



Позірк з-пад парасонаў

Сёлета свята Першамая выдалася даждлівым і малалюдным. Найперш прыйшлі тыя, хто любіць гэтае свята ці каму няма чаго рабіць. А таксама мясцовыя чыноўнікі і кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый.

Урачыстую частку Дня салідарнасці працоўных на цэнтральнай гарадской трыбуне адкрыў старшыня Слонімскага райсавета Сяргей Рагозік. З дакладам выступіў старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк, які сцісла расказаў аб праблемах і поспехах на прадпрыемствах і сельскіх гаспадарках раёна, а таксама пажадаў слонімцам берагчы здароўе. Былі ў той дзень яшчэ некалькі выступоўцаў, а таксама канцэрт самадзейных мастацкіх калектываў горада. А вечарам моладзь весялілася ў парку.

Сяргей ЧЫГРЫН, фота Віталя ГІЛЯ



Полька беларуская

9 ТРАЎНЯ – ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ. СА СВЯТАМ ВАС, ВЕТЭРАНЫ!

ГРАБЁЖ

УГРОЖАЯ ОБРЕЗОМ, "ПРИНЯЛ" ВЫРУЧКУ

Молодой человек, на вид 25-ти лет, в субботу, 3 мая, ограбил слонимский магазин "Канцтовары", забрав из кассы 42 тысячи рублей.

Как стало известно корреспонденту «ГС», в тот день на вокзале юноша попросил водителя-частника подвезти его в центр Слонима.

"Он сказал мне остановиться возле бара "Для тебя" и подождать некоторое время", — рассказывает водитель.

Спустя примерно 10 минут молодой человек вернулся в машину и сказал ехать в деревню Деревянчицы, на перекресток.

"Я его туда и отвез. Он рассчитался со мной, как положено, и вышел", — отметил мужчина.

Ну, а как выяснилось немного позже, 25-летний мужчина за те 10 минут успел ограбить магазин "Канцтовары". Грабитель навел обрез на продавщиц магазина и приказал "сдать" выручку. Одна из женщин побежала в подсобное помещение, чтобы вызвать милицию. Однако ей этого не удалось сделать — молодой мужчина выбил дверь и вывел женщину в торговый зал магазина. Продавщицам ничего не оставалось делать, как под прицелом обреза отдать грабителю деньги... В этот же день сотрудники милиции задержали преступника.

"Мне в милиции сказали, что я в рубашке родился, — говорит водитель. — Грабитель же мог и у меня деньги забрать, да и машину тоже. А имея в руках оружие, мог и выстрелить...".


Ольга ШИНКЕВИЧ

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
ТЕХНИКА для ДОМА И ОФИСА
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
2-15-30 г. Слоним, ул Советская,8

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
Магазин г. Слоним, ул. Первомайская, д.3.
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
2-30-00
ДЛЯ СТРОЙКИ ВСЁ И РЕМОНТА


ПОСТОЯННО ОРГАНИЗОВЫВАЕМ ПОЕЗДКИ
т.222-99, 250-05, (8029)-6551499, 6651499


т. 250-05, 222-99, (8029)-6574024
ПОЕЗДКИ ПО РБ. НАДЕЖНО. КОМФОРТНО. БЕЗОПАСНО на автобусах Форд-Транзит, Мерседес-Спринтер (15 мест)
ПРЕВРАТИ СВОЮ ПОЕЗДКУ в маленькое ПУТЕШЕСТВИЕ

ПОЕЗДКИ ЕЖЕДНЕВНО
Гродно Минск Слоним
тел. 44-2-88
8-0296-20-32-70

Лиц. №5-0196, 25.02.98-25.02.03, МТК РБ

Организовываем поездки на а/м "Форд-Транзит" в ГРОДНО
Доставка в любой район города

15 мест.
Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ.
Запись по тел.: 2-92-18, 8-0296-78-09-72.
Лиц. № 5-0474, 15.07.02г.-14.07.04г., МТК РБ

канцМаркет
Широкий выбор канцтоваров, бумага, офисные принадлежности. Всё в наличии. Приходите. Ул. Шоссейная, 18
Тел. 4-60-50, 4-66-50


ГАЛАКТИКА
аудио, видео, бытовая техника
Торговый павильон: рынок РПО, ул. Школьная, 2
Форма оплаты любая
8-029-6-823-723
8-029-66-585-66

Осуществляем поездки в г. Гродно
автобусом "Форд-Транзит" (15 мест). Принимаем заказы на обслуживание коллективных мероприятий.
Запись по тел. 5-24-45
8-029-630-76-60
Лиц. № 5-0482, 02.08.02г.-01.08.07г. МТК РБ

РАСЦЕНКИ на рекламные услуги в "Газеце Слонімскай":

Строчная (частная) реклама	4000 руб (повтор бесплатно),
Поздравление без фото	5000 руб.,
Поздравление с фото	5500 руб.,
Соболезнование, благодарность	3000 руб.,
Модульная реклама — 1 кв.см	813 руб.

Последний срок подачи рекламы в текущий номер — **понедельник 18.00.** Время приема рекламы с 9.00 до 18.00, воскресенье — с 11.00 до 16.00, выходной — суббота.

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

АПЫТАННЕ

ЮНЫХ СЛОНІМЦАЎ ХВАЛЮЕ АДПАЧЫНАК МОЛАДЗІ, ЧЫСЦІНЯ РОДНАГА ГОРАДА І ЯГО ГІСТОРЫЯ

Калі б вы працавалі ў Слоніме журналістамі, пра што найперш напісалі б у мясцовай прэсе? На такое пытанне нядаўна адказвалі юныя сябры школы маладога журналіста, якая дзейнічае пры слонімскім маладзёжным грамадскім аб'яднанні "Ветразь" і Слонімскай філіі Беларускай асацыяцыі журналістаў. Адказы атрымаліся самыя розныя.


Фота Віталя ГІЛЯ

ВАЛЯНЦІН ГРЫНЕВІЧ, СШ № 9:

— Я напісаў бы пра гістарычнае мінулае свайго роднага горада, а таксама пра яго знакамітых людзей. Моладзь павінна пра іх ведаць.

АНЖЭЛА ПУЛКО, СШ № 9:

— Я напісала б пра тое, чым сёння займаецца наша моладзь. Бо на вуліцу ў наш час страшна выходзіць, мамы баяцца адпускаць сваіх дзяцей адных гуляць. З'явіліся скінхеды, якія на вуліцах могуць грубіць прахожым. Шмат швэндаецца юнакоў, якія нідзе не працуюць, нічым не цікавяцца. Таму лічу, што дзяцей да дабра, да прыгажосці, да чысціні чалавечых узаемаадносін трэба прывучаць з маленства. Для моладзі неабходна ствараць розныя цікавыя і карысныя клубы, тэатры, гурткі, праводзіць разнастайныя конкурсы. Пра гэта трэба і пісаць.

АНАСТАСІЯ ЖЫГАВЕЦ, СШ № 9:

— Калі б я была журналісткай, найперш напісала б пра экалагічны стан нашага горада. А ён не з лепшых.

ВОЛЬГА ДЗЕМЯШКЕВІЧ, СШ № 8:

— Тэмаў, звязаных з нашым Слонімам, шмат. Але найгалоўнейшая — гэта тэма адпачынку моладзі. Нядаўна я вырашыла прагуляцца са сваім сябрам. Было цудоўнае надвор'е. Хацелася дзе-небудзь прысесці, паесці марожанага, папіць соку, ды і так проста пагутарыць. Але падчас нашай прагулкі мы так і не знайшлі добрага кафэ. Па дарозе нам трапляліся паламаныя лаўкі і смецце. Няўжо гэта не праблема?

ІРЫНА ДУПАК, СШ № 9:

— Аб праблемах моладзі, іх узаемаадносінах з бацькамі, аб тым, ці можна сёння спадзявацца на сваіх сяброў, а таксама напісала б пра якую-небудзь мясцовую музычную групу.

ІРЫНА АРЛОВА, СШ № 9:

— Найперш мяне хвалюе і пра што хацелася б напісаць, дык гэта пра будаўніцтва тэатра ў цэнтры горада і пра рэстаўрацыю сінагогі на рынку.

АНАСТАСІЯ МУРАЕВА, СШ № 5:

— Пісаць трэба пра чыноўніцкі апарат: як яны выконваюць свае службовыя абавязкі, як адносяцца да людзей і г.д.

ЭЛЕАНОРА КУЗЬМІНА, СШ № 9:

— Тэмай маіх першых артыкулаў быў бы знешні выгляд нашага старажытнага горада: яго архітэктурныя помнікі, будынкі, помнікі (якіх няма) нашым знакамітым землякам. Хочацца, каб Слонім быў культурным цэнтрам Прынёмання. І яго не сорамна было б паказваць турыстам.

ВЕРАНІКА КАЗАК, СШ № 3:

— Напісала б пра дзіцячы дом, бо цяпер я цвёрда ўпэўнілася, што без мамы і таты пражыць немагчыма ў гэтым халодным свеце.

АЛЕНА СІДАР, СШ № 9:

— Калі б была журналісткай, я адразу напісала б пра настаўнікаў-філолагаў сваёй роднай школы, яны заслугоўваюць гэтага.

ГАННА АРЛОВА, СШ № 9:

— Напісала б пра бяздомных сабакаў і катоў, якіх вельмі шмат бегае без нагляду па вуліцах і пад'ездах дамоў нашага горада. Гэта сур'ёзная тэма, бо падобныя жывёлы з'яўляюцца распаўсюджвальнікамі розных хвароб.

КАЦЯРЫНА ПЯТРОВА, СШ № 9:

— Перш-наперш у мясцовым друку з'явіўся б мой матэрыял аб тым, чаму да сённяшніх дзён так і не пабудавалі маладзёжны цэнтр у былой стайні Пуслоўскага ў Альбярціне. А некалькі гадоў назад справа ішла поўным ходам. І планавалася ў гэтым прыгожым будынку адкрыць на першым паверсе бар, залу для сямейных урачыстасцяў, а на другім — гасцініцу. Але ўсе планы засталіся толькі на паперы.

ГАЛІНА БАНДАРЭНКА, СШ № 7:

— Я б не стала пісаць пра тое, што ў Слоніме дрэнна ходзяць гарадскія аўтобусы, што вуліцы брудныя і г.д. А напісала б пра тое, што ў горадзе змянілася ў лепшы бок. Як-ніяк, а горад наш з кожным годам прыгажэе. І гэта таксама трэба заўважаць.

АНТОН ТРАФІМОВІЧ, СШ № 9:

— Мяне хвалюе стан роднай мовы ў нашым горадзе, пра гэта я і пісаў бы. Вельмі крыўдна, што ў Слоніме знікаюць беларускамоўныя шыльды, што людзі да свайго роднага сталі абыякавымі. На сённяшні час гэта становіцца праблемаю № 1.

ВАЛЕРЫЙ ЕПІФАНАЎ, СШ № 1:

— Напісаў бы артыкул аб узаемаадносінах вучняў і настаўнікаў.

АЛЕНА КАЗЯЛЕЦКАЯ, СШ № 3:

— Я напісала б пра тое, колькі каштуе платная адукацыя. І як цяжка сёння бацькам вучыць сваіх дзяцей не толькі ў ВНУ, але і ў сярэдне-адукацыйных школах.

Сяргей ЧЫГРЫН

З ЗАЛЫ СУДА

ДЗЯЛЬБА БАЦЬКОЎСКАГА ЎЧАСТКА

У беларускай літаратуры ёсць хрэстаматыйнае апавяданне Віктара Карамазава "Дзяльба кабанчыка". Там аўтар расказвае, як гарадскія дзеці дзялілі выгадаванага бацькамі кабана, і што з гэтага атрымалася.

Гісторыя, якая сталася прадметам разбіральніцтва ў слонімскім судзе, нечым нагадвае твор беларускага класіка. Толькі дзялілі сваякі не свініну, а зямельны ўчастак. Суддзя, якая вяла гэтую справу, з падобным выпадкам сустрэлася ў сваёй практыцы ўпершыню.

А пачалася гэтая гісторыя ў далёкія часы мінулага ўжо веку. Мудры і дальнябачлівы чалавек Іван Іванавіч Шэст вырашыў пабудаваць для сваіх дарослых дзяцей дом. Бо сталася так, што сын прывёў у хату маладую жонку, а дачка — зяця. Патрэбна было неяк пашыраць жыллё. У сакавіку 1967 года Івану Шэсту выдзелілі ўчастак пад будаўніцтва на адной з вуліц горада, дзе вялося прыватнае будаўніцтва. Дом будавалі ажно да 1980 года. А калі патрэбна было прымаць работу, нечакана ўзнікла праблема — гаспадар адступіў ад праекта. Па тым часе адступленне ўбок ад праекта хаця б на 20 сантыметраў лічылася вялікім парушэннем. Пэўныя гарадскія службы не прымалі хату доўга, патрабуючы будынак перарабіць, згодна праекта. А як пераробіш, калі будаўніцтва завершана? Маючы жыццёвую мудрасць, бацька будаваў хату на дзве паловы. З разліку, што ў адной палове будзе жыць сям'я сына, а ў другой — дачкі. Урэшце рэшт ад участка ў 6 сотак з боку завулка адрэзалі 249 квадратных метраў. І ў кастрычніку 1981 года рашэннем выканкама дом прынялі з улікам праектных адступленняў. І як толькі хата была зарэгістравана, бацька афарміў дамову дарэння. Палову дома ён падараваў сыну, а другую палову — зяцю. Сем'і засяліліся ў новую хату, кожная на сваёй палове. У 1984 годзе яны разгарадзіліся. БТІ устанавіла межы зямельнага ўчастка кожнай сям'і. Сынавы ўчастак па плошчы аказаўся меншы, чым у зяця. Аднак ніякіх непаразуменняў у сувязі з гэтым спачатку не было. Сем'і жылі дружна. На сваёй палове кожны гаспадар узводзіў гаспадарчыя пабудовы. Зяць пабудаваў гараж, летнюю кухню. Па дамоўленасці і за плату на будаўніцтве працаваў яго сусед-швагер, паколькі з'яўляецца добрым майстрам. І такім супрацоўніцтвам бакі засталіся задаволеныя. Добразычлівыя сваяцкія і суседскія адносіны трывалі да таго часу, пакуль брат не пасварыўся з сястрой.

А калі паміж сваякамі прабегла чорная кошка, тады сын Івана Шэста Мікіта і ўспомніў, што яго прысядзібны ўчастак пры раздзеле аказаўся меншым, чым у сястры са шваграм, і напісаў іск у суд аб перадзеле ўчастка. Аднак зямля на баку швагра была забудавана. Дазвол на будаўніцтва ў свой час гаспадару даў выканкам на цалкам законных падставах. Работнікі зямельнага аддзела, а таксама аддзела архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама пасля дэтальнай праверкі на месцы канстатавалі той факт, што перадзяліць нейкім чынам зямлю, каб да ўчастка Шэста дадаць тры вольныя соткі ад участка яго швагра Савіннікава фізічна не магчыма. Тады Шэсту прапанавалі ўзяць зямлю ў іншым месцы. Але ад такога вырашэння справы ён катэгарычна адмовіўся. У сваю чаргу Савіннікаў падаў сустрэчную іскавую заяву да Шэста на права карыстання сваёй летняй кухняй. Суд вынес рашэнне аб зямельным сервітуце — Шэсту выдзелілі 35 квадратных метраў зямлі на ўчастку швагра, дзе стаіць летняя кухня, а апошняму дазволілі ёй карыстацца.

Мікіту Шэста такое рашэнне не задаволіла, і ён напісаў скаргу з просьбай адмяніць судовае рашэнне, матывуючы гэта тым, што суд пры разглядзе яго іскавай заявы прыняў пад увагу не ўсе акалічнасці справы. А менавіта, што пры раздзеле зямельнага ўчастка ён не даваў швагру сваю згоду на будаўніцтва той жа летняй кухні і іншых збудаванняў. Атрымліваецца, што Мікіта Шэст аспрэчвае законнасць дазволу на будаўніцтва, якое Савіннікаву даў калісьці выканкам.

Фармальна скаргу Шэста павінен будзе разглядаць абласны суд. Такім чынам брат дабіўся таго, чым прыгразіў сястры падчас сваркі — "зацягаць" па судах. Бо ў зале суда Шэст сказаў адкрытым тэкстам, што зямля тая, у прынцыпе, яму і непатрэбна.

А мудры бацька, які калісьці будаваў сваім дарослым дзецям дом, наўрад ці падумаць мог, што пасля яго смерці дзеці будуць судзіцца з-за трох сотак.

P.S. З этычных меркаванняў імёны і прозвішчы герояў гісторыі зменены.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРОИСШЕСТВИЯ

ПОДОЖГЛИ МАШИНУ

Поздно ночью 29 апреля, во вторник, возле дома № 36, что по улице Ершова, неизвестные разбили стекло в автомобиле ВАЗ-2103 и бросили вовнутрь бутылку с зажигательной смесью.

В результате, от салона «Жигулей» почти ничего не осталось.

ГОРЕЛ САРАЙ

В воскресенье, 4 мая, в деревне Гринки Слонимского района загорелся деревянный сарай.


Пожар уничтожил крышу, перекрытия постройки, а также повредил стены.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ВНИМАНИЕ!

Слонимский хлебозавод приглашает жителей и гостей города на предпраздничную выставку-продажу кондитерских изделий, которая будет проводиться **8 МАЯ (ЧЕТВЕРГ) С 10-00** в магазине «Горячий хлеб» (ул. Чкалова, 6).

Вашему вниманию будет представлен широкий ассортимент тортов ко Дню Победы, а также последние разработки мастеров-кондитеров хлебозавода.



ПРИХОДИТЕ И ПОЛУЧИТЕ ИСТИННОЕ УДОВОЛЬСТВИЕ от нашей продукции!

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

НАВІНЫ

СЛОНІМЕЦ — ЛАЎРЭАТ

Слонімец Аляксандр Звяровіч атрымаў званне лаўрэата Першага Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні.

Гэты конкурс нядаўна адбыўся ў Мінску.

Перамога на ім дае Аляксандру Звяровічу права выступаць на Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі ў Маладзечна.

НОВАГА АЛЬБОМ "ГРЫМАТЫ"

Першага мая ў Слонімскім РДК адбылася прэзентацыя новага музычнага альбома народнага ансамбля народнай музыкі і песні "Грымата", якім кіруе Валянціна Шэронава.

Гледачы, якія завіталі ў той дзень на канцэрт, пачулі новыя беларускія народныя песні ў выкананні слонімскіх артыстаў, а таксама ранейшыя папулярныя песні, накшталт "Два дубкі", "Шыпшына" і іншыя.

Аматары "Грыматы" перад пачаткам канцэрта змаглі набыць сабе аўдыёкасеты з песнямі гэтага ансамбля.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ЗЛОДЗЕЯ ЗНАЙШЛІ

У выніку пошукавых мерапрыемстваў работнікі крымінальнага вышуку затрымалі злодзея, які ўкраў грошы з дому бабулі па Шасэйнай вуліцы.

Як аказалася, мужчына жыў непадалёку ад хаты сваёй ахвяры.

Па факту крадзяжу ўзбуджана крымінальная справа.

ВЫМАГАЛЬНІКА ЗАТРЫМАЛІ

На мінулым тыдні з заявай аб вымагальніцтве ў іх грошай у міліцыю звярнуліся дзве маладыя жанчыны.

Хутка асоба вымагальніка была ўстаноўлена. Супраць яго ўзбуджана крымінальная справа.

СПРАБАВАЎ ЗГВАЛТАВАЦЬ

У ноч з 28 на 29 красавіка маладая жанчына вярталася з працы дамоў па вуліцы Пушкіна.

У раёне ваенкамата на яе накінуўся мужчына, які пачаў яе душыць і спрабаваў згвалтаваць. На шчасце, побач своечасова аказаліся работнікі міліцыі, якія прадухілілі горшае.

Гвалтаўніка арыштавалі. Супраць яго ўзбуджана крымінальная справа.

Мікола КАНАНОВІЧ

АДЛЯЦЕЎ РУХАВІК

Днямі на праспекце Незалежнасці ў Слоніме сутыкнуліся дзве іншамаркі — "Аўдзі" і "Гольф".

У выніку сутыкнення ніхто не пацярпеў, але ўдар быў настолькі моцным, што ў "Гольфа" аж адляцеў рухавік.

Сяргей ЧЫГРЫН

ІНТЭРВ'Ю

Аляксандр СУША: "ЦЯЖЭЙ ЗА ЎСЁ ПРАЦАВАЦЬ З ПАДАЗРОНЫМІ Ў ЗЛАЧЫНСТВЕ..."

Нарадзіўся ў вёсцы Елка Зэльвенскага раёна. 34 гады. У міліцыі працуе 12 гадоў. Сёлета скончыў акадэмію МУС. З кастрычніка 2001 года ўзначальвае аддзел крымінальнага вышуку Слонімскага РАУС.



Аляксандр Суша

— Аляксандр Мікалаевіч, у пачатку нашай гутаркі абазначце ў агульных рысах, хто сёння працуе ў крымінальным вышуку, і што сабой уяўляе ваша праца?

— Аддзел крымінальнага вышуку складаецца з 12 чалавек, уключна са мной. Сутнасць нашай працы — лінейна-занальны кантроль. Гэта значыць, што адны аператыўнікі замацаваны за пэўнымі зонамі і вядуць там працу па раскрыцці злачынстваў, а іншыя працуюць над іх раскрыццём сярод непаўналетніх, вышукваюць без вестак прапаўшых, а таксама тых, хто парушыў закон і хаваецца ад правасуддзя, і іншае.

— Прайшло ўжо чатыры месяцы з пачатку года. Колькі за гэты час на Слонімшчыне адбылося злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку, колькі з іх раскрыта, а колькі не раскрыта?

— На сённяшні дзень (30.04.03г. — **М.К.**) па лініі крымінальнага вышуку зарэгістравана 155 злачынстваў. З іх не раскрытымі пакуль застаюцца 42. Калі параўноўваць з адпаведным перыядам мінулага года, то там мы маем лічбу ў 136 злачынстваў, з якіх не раскрытымі засталіся 33. Было менш злачынстваў з пачатку года і, адпаведна, менш іх заставалася нераскрытымі.

— І які характар маюць здзейсненыя сёлета злачынствы? Чаго здараецца менш, а чаго больш?

— У гэтым годзе ўжо здараліся рабаўніцтвы, разбоі, згвалтаванні. Але ільвіная доля ўсіх злачынстваў — гэта крадзяжы. Іх зарэгістравана з пачатку года 87. І з гэтых 87-мі налічваецца толькі тры выпадкі крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці, астатнія — з кватэр і дамоў грамадзян і 4 крадзяжы прыватнага аўтатранспарту.

— І хто ён такі, сучасны сярэднестатыстычны злодзей, што яго падштурхоўвае да злачынства?

— Як правіла, гэта людзі ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў, раней судзімыя, якія нідзе не працуюць. Хаця крадуць і непаўнагадовыя, і тыя, каму за сорак. А прычыны гэтага бываюць розныя: нізкі ўзровень жыцця, беспрацоўе, крымінагенны асяродак. Скажам так, што прычыны крадзяжоў маюць сацыяльна-эканамічны характар.

— Кожны з нас можа стаць ахвярай злодзеяў. І ўсё-такі, як абараніць сваю маёмасць ад крадзяжоў? Што б вы параілі нашым чытачам?

— Найбольш надзейны сродак, каб засцерагчыся ад "дамушнікаў", — здаць дом, кватэру ці гараж пад аўтаматызаваную сістэму сігналізацыі пазаведамаснай аховы "Алеся". Тым самым можна папярэдзіць не толькі крадзёж са свайго жытла, але і разбойны напад. За апошнія гады не было ніводнага выпадку нераскрытых крадзяжоў на аб'ектах, якія знаходзяцца пад аховай. І тыя злачынцы, што рызыкнулі пайсці "на сігналізацыю", былі своечасова затрыманы.

— Аляксандр Мікалаевіч, але ж здаць жыллё пад ахову каштуе немалых грошай, і гэта не кожнаму па кішэні? Магчыма, ёсць больш танныя спосабы засцерагчыся ад злодзеяў?

— Сапраўды, бяспека каштуе грошай. Абсталяванне ахоўнай сігналізацыі для аднапакаёвай кватэры каштуе, прыкладна, 200 тысяч рублёў, для двухпакаёвай — 230 – 250 тысяч, трохпакаёвай — 260 – 290 тысяч і для чатырохпакаёвай — за 300 тысяч рублёў. Абанентская плата аб'яднанню "Ахова" складае адну базавую велічыню — 13500 рублёў у месяц. Канечне, сумы значныя. Але для тых, у каго ёсць падставы асцерагацца злодзеяў, думаю, такая плата па кішэні. Тут, галоўнае, не паскупіцца на ўстаноўку абсталявання, бо скупы, як вядома, плоціць двойчы.

— А што параіце тым, каму сігналізацыя ўсё ж не па кішэні?

— Чалавеку, які на доўгі час пакідае свой дом ці кватэру, варта папрасіць суседзяў, каб прыглядалі за жыллём. І, канечне, на дзвярах павінны быць надзейныя замкі, не кнопачныя — іх адкрыць лягчэй за ўсё. На дачах лепш не выкарыстоўваць навясныя замкі — яны лёгка збіваюцца. Уразныя замкі ў дзвярах і закратаваныя вокны могуць стрымаць злодзея. Добра, калі ў дачным кааператыве ёсць вартаўнік. Уладальнікам аўтатранспарту пажадана ўстанавіць на гаражы і аўтамабілі сігналізацыю. А ў начны час, калі няма магчымасці паставіць машыну ў гараж, лепш адагнаць яе на платную стаянку. У нас ужо налічваецца недзе каля 20-ці выпадкаў крадзяжоў аўтамагнітолаў. Часцей за ўсё крадуць падлеткі. А нядаўна ў салон аўтамабіля нават кінулі бутэльку з гаручай сумессю. Салон злёгку выгараў. А калі б гаспадар паставіў аўтамабіль на платную стаянку, то машына засталася б цэлай. Што яшчэ?.. Зараз пачаўся дачны сезон, і многія слонімцы карыстаюцца веласіпедамі. Веласіпедыстам варта абзавесціся добрымі замкамі і надзейнымі стаяначнымі ланцугамі, каб прымыкаць веласіпед да чаго-небудзь, што злодзей не зможа панесці. Каля крамаў лепш ставіць сваю двухколку на спецыяльныя веласіпедныя стаянкі, калі такія ёсць.

— Аляксандр Мікалаевіч, за час працы ў крымінальным вышуку раскрыццё якога злачынства вам найбольш запомнілася?

— Гэта забойства Дабрыяна. Яно было 10 месяцаў не раскрыта, мела вялікі грамадскі рэзананс. Раскрыць гэтае злачынства было справай гонару работнікаў крымінальнага вышуку. Мы зрабілі ўсё магчымае, каб устанавіць асобы злачынцаў. І цяпер нам не сорамна перад сям'ёй Дабрыяна. Адбыўся суд, і кожны з групы злачынцаў панёс сваё пакаранне. Таксама ў бягучым годзе было раскрыта некалькі выпадкаў крадзяжу аўтамашын. Адзін крадзёж мінулага года, а яшчэ адзін — пяцігадовай даўніны. І канечне, прыемна было даведацца чалавеку, што яго "Жыгулі", хоць і праз пяць гадоў, але былі знойдзены. Што тут хочацца сказаць? Каб тыя людзі, якія пацярпелі ад злачынных пасягненняў на сваю маёмасць, не гублялі надзеі, не адчайваліся і не думалі, што крымінальны вышук нічога не робіць. Мы заўжды займаемся справай і раскрываем злачынствы як бягучага, так і мінулых гадоў.

— І напрыканцы нашай гутаркі апошняе пытанне. Што, на вашу думку, сёння самае цяжкае ў працы работнікаў крымінальнага вышуку?

— Цяжэй за ўсё працаваць з падазронымі ў злачынстве асобамі. Гэтая праца вельмі напружаная, вымагае нерваў. І каб паспяхова весці допыт падазраных у здзейсненым злачынстве, акрамя спецыяльнай падрыхтоўкі, сышчык павінен мець моцнае псіхалагічнае і фізічнае здароўе.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

ВУЧАНЬ 2003 ГОДА

Вучань адзінаццатага класа Слонімскай гімназіі № 1 Ігар Круглік названы вучнем 2003 года.

Так вырашыла журы конкурсу, арганізатарам якога было ўпраўленне адукацыі Слонімскага райвыканкама.

У конкурсе прымалі ўдзел 22 вучні з гарадскіх і сельскіх школ раёна.

Дарэчы, Ігар Круглік — адзін з мацнейшых юных матэматыкаў нашага горада, на раённай школьнай алімпіядзе ён заняў першае месца.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ГРАФІЦІ НА СЦЕНАХ АПТЭКІ

29 красавіка з заявай у міліцыю звярнулася загадчыца слонімскай аптэкі №108 па вул. Ф.Скарыны, калі ўбачыла размаляванымі фарбай з балончыка сцены і вокны сваёй установы.

Работнікі праваахоўных органаў нагадваюць юным аматарам насценнага жывапісу, а таксама іх бацькам, што падобныя дзеянні караюцца па закону.

У МІНЧАНІНА ЎКРАЛІ ПРЫЧЭП

Не пашчасціла жыхару Мінска, які на сваім легкавіку з прычэпам ехаў са сталіцы ў Польшчу.

На дарозе ў раёне вайсковага палігона калі вёскі Чапялёва ў аўтапрычэпе зламаўся прычапны дышаль.

Вадзіцель палічыў за лепшае павярнуць дамоў, каб прывезці неабходную дэталь. А калі мінчанін вярнуўся назад, то свой аўтапрычэп на месцы не знайшоў.

Мікола КАНАНОВІЧ

магазин Мастер
Двери
окна
качество высокое цены доступные
металлические, из дерева
смесители для кухни, ванны
оконная и дверная фурнитура
наличный и безналичный расчет
УЛ. КУПАЛЫ,5
Т. 4-63-89; 8-0296-589179

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ПРИЗЫВ 2003

ПРИШЛА ПОРА ПОСЛУЖИТЬ ОТЕЧЕСТВУ



Сейчас в Слонимском военкомате проводится медицинское освидетельствование граждан, подлежащих призыву на военную службу весной–летом 2003 года.

В этом году медицинскую комиссию должны пройти около 600 призывников, призывную комиссию — порядка 800 человек. Для сравнения, весной 2002 года призывную комиссию прошёл 781 призывник, из которых 138 были отправлены в войска. Остальные получили различные отсрочки, остались в резерве, переданы в запас и признаны негодными к военной службе.


В нынешнюю призывную компанию основные отправки будут производиться с 7 по 16 июля. Присяга назначена на 3 августа.

Кроме того, в течение мая принимаются документы от граждан, решивших связать свою судьбу с армией. Таких уже имеется более 40 человек, которые собираются поступать в белорусскую Военную академию и высшие учебные заведения России. Среди них, Воронежский военный авиационный институт, филиал военного финансово-экономического университета (г.Ярославль), военно- транспортный университет ЖДВ (г.Санкт-Петербург), Московский военный институт ФПС РФ и многие другие.

Стоит отметить, что абитуриенты сдают вступительные экзамены в Минске, здесь же проходят курс молодого бойца и лишь на обучение выезжают в Россию. По окончании вуза воинское звание «лейтенант» им присваивает Министр обороны Беларуси и они проходят службу на территории нашей страны.

Более подробную информацию о поступлении и о призыве на действительную срочную военную службу можно получить непосредственно в военкомате или по телефонам 2-30-76 и 2-18-42.

Александр ЗАХАРЕНКО



Фота IREX/ProMedia

Медосмотр призывников

ПРИЗЫВ 2003

ПРИКАЗ НАДО ВЫПОЛНЯТЬ

Слонимский военный комиссар издал приказ о призыве граждан на срочную военную службу в Вооруженные Силы Беларуси.

Призыв пройдет на территории Слонимского района пройдет с 23 апреля по 31 июля 2003 года.

Явке на призывной участок подлежат все граждане 1985 года рождения, которым ко дню призыва исполнилось 18 лет, а также граждане, родившиеся в 1976-1984 годах, у которых истекли отсрочки от призыва, или не призванные ранее на срочную военную службу по различным причинам.

В приказе отмечается, что все граждане, подлежащие призыву, обязаны прибыть на призывной участок по адресу: г. Слоним, ул. Пушкина, 52 точно в срок, указанный в повестке. А граждане, не получившие повесток о явке для призыва на срочную военную службу, обязаны прибыть в РВК 16 мая 2003 года, имея с собой документы, удостоверяющие личность.

Стоит отметить, что те лица, кто уклонится от призыва, понесут ответственность согласно действующему законодательству.

Александр ЗАХАРЕНКО

ІНТЕРВЬЮ

Вячеслав АДАСИК: «МЫ ОБЩАЕМСЯ ПО РАДИОСВЯЗИ С РАДИОЛЮБИТЕЛЯМИ ВСЕГО МИРА»

В эти дни слонимские радиолюбители-коротковолновики несут вахту памяти, посвященную Дню Победы.

Накануне корреспондент «ГС» встретился с руководителем радиостанции слонимского клуба радиолюбителей Вячеславом Адасиком. Эта общественная организация действует при детско-юношеской спортивной школе. А радиостанция является коллективным детищем ДЮСШ и профсоюзного комитета камвольно-прядильной фабрики.

— Вячеслав Валентинович, расскажите, что собой представляет ваша организация.

— Наша радиостанция основана в 1965 году. Сейчас она подчинена Белорусской федерации радиолюбителей и радиоспорта (БФРР). За время существования радиоклуба многие наши ребята не только овладели навыками работы в радиоэфире, но и получили знания, которые пригодились им в дальнейшей жизни. Некоторые закончили радиотехнические институты и военные учебные заведения связи. Они и сейчас работают в эфире, имеют личные позывные.

— И кто сегодня входит в состав клуба?

— Актив нашего клуба — это преподаватель ДЮСШ Юрий Корниленко, заместитель главного энергетика КПФ Юрий Лавринович, предприниматель Сергей Данько и студент-заочник Гродненского университета Денис Гиль.



Слонимские радиолюбители

— Поясните, пожалуйста, чем вы занимаетесь?

— Проводим сеансы радиосвязи с радиолюбителями всех стран мира, участвуем в чемпионатах Беларуси, в международных соревнованиях. Принимаем участие в ежегодном мемориале «Победа» специальным позывным. Раньше проводились первенства Гродненской области по скоростной радиотелеграфии. Неоднократно эти соревнования проходили в Слониме. Их организовывал Юрий Иванович Корниленко. Кстати, он и сейчас обучает азбуке Морзе всех желающих. Его воспитанники постоянно занимали призовые места на областных и республиканских соревнованиях. Мы также участвуем в экспедиции по районам Беларуси, в которых нет своих радиолюбителей.

— А что собой представляет радиолюбительская экспедиция?

— Она даёт возможность открыть любителю новую территорию, страну, остров в океане. Есть программа «Jota», которая позволяет работать с территории редких необитаемых островов, расположенных вдали от архипелагов.

— И кто из членов вашего клуба участвовал в подобных экспедициях?

— Члены клуба лишь поддерживали связь с экспедициями, которые принимали участие в данной программе.

— А чем вы занимаетесь сейчас?

— В данный момент готовимся к участию в мемориале «Победа – 58». Мы проводим радиосвязи с радиолюбителями всего мира. Это позволяет приобрести зачётные очки для получения диплома «Победа – 58», который выдаёт оргкомитет радиоэкспедиции, находящийся в России. Членом данной организации являются и слонимчане. В состав комитета радиоэкспедиции «Победа» от Беларуси включён Юрий Иванович Корниленко.

Тут к диалогу подключился и сам Юрий Иванович. Он рассказал, что 5 мая состоится открытие мемориала (беседа проводилась 4 мая — **А.З**), а 8 мая пройдёт вахта памяти. Это встреча ветеранов на определённой частоте, их воспоминания, общение. А 11 мая коллективная радиостанция будет принимать участие в международных соревнованиях «Миру – мир».

— И как вы существуете в нынешних условиях?

Ю.И. — Зарплату получаю только я, так как работаю здесь в ДЮСШ. Остальные занимаются любимым делом на энтузиазме. В принципе, электроэнергию и аренду помещения оплачивает КПФ. Мы же стараемся изыскивать некоторые средства для уплаты членских взносов в БФРР.

В.В. — В основном, организаторской работой занимается Юрий Иванович. Ему это проще. Он находится на месте.

— Что же, Вячеслав Валентинович, Юрий Иванович, большое спасибо за беседу. Поздравляем вас с Днём радио и желаем творческих успехов в радиоспорте.

Александр ЗАХАРЕНКО

ЗДАРЭННЕ

ПАБІЛІСЯ Ў ДУШАВОЙ

У душавым пакоі Слонімскага ільнозавода адбылася бойка паміж 35-гадовым рабочым гэтага прадпрыемства і 78-гадовым пенсіянерам.

Вядома, што маладзейшы па гадах пабіў старэйшага. Прыйшлося звярнуцца па дапамогу ў міліцыю. Аб гэтым паведаміла газета "МВ".

Сяргей ЧЫГРЫН

КРЫМІНАЛ

РАСЦЕ ЗЛАЧЫННАСЦЬ СЯРОД ПАДЛЕТКАЎ

Гродзенскі аблвыканкам прызнаў недастатковай працу Слонімскага, Дзятлаўскага, Ваўкавыскага і Гродзенскага выканаўчых камітэтаў па кардынацыі дзейнняў органаў унутраных спраў і іншых дзяржаўных арганізацый па прафілактыцы правапарушэнняў сярод непаўнагадовых.

Як паведамлялася ў абласным друку, ва ўсіх названых раёнах у першым квартале бягучага года назіраўся значны рост злачынстваў сярод падлеткаў у параўнанні з аднаведным перыядам мінулага года. У цэлым па вобласці падлеткавая злачыннасць узрасла на 23,8 працэнта. Характэрнымі для непаўнагадовых сталі такія злачынствы як крадзяжы, разбойныя напады, угоны транспарту і хуліганствы.

У Слоніме ў першым квартале бягучага года ў інспекцыі па справах непаўнагадовых стаялі на ўліку 189 падлеткаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ГРОДНО

ОБМАНУЛ НАРОД НА 5 000 ДОЛЛАРОВ

В отношении жителя Гродненской области возбуждены уголовные дела, предусмотренные частью 1 статьи 209 и частью 3 статьи 233 Уголовного кодекса Беларуси — мошенничество и незаконная предпринимательская деятельность.

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе Комитета государственного контроля, Управлением департамента финансовых расследований КГК по Гродненской области установлено, что подозреваемый под предлогом оказания содействия по трудоустройству в Швеции путем обмана в ноябре 2002 – январе 2003 годов завладел средствами граждан в размере около 5 тысяч долларов США.

Геннадий ШАРИПКИН

ВОЛКОВЫСК

СВОИ РАБОТЫ ПОСВЯЩАЕТ ПРЕКРАСНОМУ

Днями в Волковыске в доме-музее имени Багратиона открылась выставка картин местного художника Виктора Росько.

Виктор Иванович работает преподавателем Волковыского педагогического колледжа, является членом Союза художников Беларуси. Пишет он преимущественно акварелью. Сюжеты его картин – улицы старого города, явления природы, пейзажи. Многие работы художника находятся в частных коллекциях Польши, Германии, Чехии, Канады.

ВЗЯЛ И ПОБИЛ СЫНА

Волковысская милиция возбудила уголовное дело по факту угона... алюминиевой лодки, которая принадлежала жителю поселка Рось.

Возбуждено уголовное дело также в отношении жителя г.Волковыска, который жестоко избил своего 20-летнего сына. В результате отец оставил на теле юноши многочисленные повреждения.

Александр ДАНИЛИН

МАСТЫ



Мастоўскія прыгажуні

Фота Віталя ГІЛЯ

ГРОДНО

ЧУДОТВОРНАЯ ИКОНА "СПАСА ВСЕДЕРЖИТЕЛЯ" – ЕДИНСТВЕННАЯ В МИРЕ

Три чудотворные православные иконы из России были выставлены в Гродно.

Кровоточивую икону "Спаса Вседержителя" и две мироточивые – "Богоматери" и "Николая Угодника" – доставили в церковь Рождества Богородицы из Барановичей. Они пробыли в Гродно до 4 мая. За это время в церкви прошли специальные акафисты и молитвы. Доступ к ним открытый, каждый желающий мог приложиться к иконам и попросить об излечении и спасении. По словам хозяйки икон, россиянки Ольги Ефимовой, впервые иконы стали испускать душистую жидкость в ее доме, в поселке Дзержинский под Екатеринбургом, в 1997 году. Со временем к ней стали приходить на молебны люди, и однажды во время службы на глазах верующих из иконы "Спаса Вседержителя" пошла темная жидкость. По благословению патриарха Московского и всея Руси Алексия II была проведена экспертиза жидкости, засвидетельствовавшая, что из иконы потекла кровь IV группы – такой же, как и на Туринской плащанице.

Как утверждает Ольга Ефимова, икона "Спаса Вседержителя" – единственная в мире, которая кровоточит постоянно.

Алеся СИДЛЯРЕВИЧ

МАСТЫ

АДКРЫТА ВЫСТАВА НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

У мастоўскім музеі "Лес і чалавек" адкрыта выстава мясцовых умельцаў: разьбяроў па дрэву і пляценню з саломкі. Трэба адзначыць, што гэта вырабы не прафесійных майстроў.

Адкрывае выставу падбор твораў мастаўчаніна Сяргея Карозы. Ён працуе ў арыгінальным стылі: інкрустацыя з саломкі. Асабліва ўражвае створаны ім вобраз праведніка. Не ва ўласцівым для жанчыны стылі працуе Зінаіда Давыдзік.

Яна разбяр. І яе задумы, увасобленыя ў дрэве, па тэхніцы выканання не ўступаюць работам Міхаіла Маскевіча з вёскі Мікелеўшчына, Мікалая Ярца з Пацэвічаў ды мастаўчаніна Юрыя Сарокі.

Сваё бачанне свету прадставіў народны ўмелец з вёскі Пескі Генадзь Пятровіч.

Тое, што можна стварыць з саломкі, наведвальнікі могуць пабачыць на стэндах Ніны і Алены Мініных. Сабраныя вырабы могуць упрыгожыць экспазіцыю любога музея.

А гэта толькі часцінка тых народных талентаў, што твораць на Мастоўшчыне.

Язэп ПАЛУБЯТКА

МАСТЫ

СЕЛЬСАВЕТ ЗАЦЯКАЕ

Адміністрацыйны будынак у вёсцы Курылавічы Мастоўскага раёна, дзе месціцца праўленне калгаса "Ленінец", а таксама сельсавет і станцыя тэлефоннай сувязі, неадкладна патрабуе рамонту даху.

Падчас навальніцы вада стаіць не толькі ў калідоры на другім паверсе, але і сцякае па сценах першага. Тым не менш, рамонт будынка ў гэтым годзе не плануецца.

КОНЬ НАБЫВЕ ВАРТАСЦЬ

Адсутнаць тэхнікі і паліва падчас веснавых работ прымушае людзей скарыстоўваць для гэтай патрэбы каня.

Гэтая цяглавая сіла набыла вялікую вартасць на вёсцы. Напрыклад, за тое, каб узараць адну сотку агарода, наймальнік павінен заплаціць 2-3 тысячы рублёў. Акрамя гэтага, вясковец абавязаны пакарміць каня і пачаставаць гаспадара.

СУВЯЗЬ ПАШЫРАЕЦЦА

Распачалася праца па ўводу ў эксплуатацыю электроннай АТС у вёсцы Рагозніца Мастоўскага раёна.

З заканчэннем мантажных работ ёмістасць станцыі пашырыцца на сто нумароў. Абанентамі станцыі жыхары дзесятка навакольных вёсак.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВОЛКОВЫСК

ВОЗРОЖДАЮТСЯ СТАРЫЕ ТРАДИЦИИ

К первомайским праздникам в парке культуры и отдыха было приурочено первое выступление Волковыского оркестра духовых инструментов.

За восемь месяцев вновь созданный творческий коллектив подготовил интересную музыкальную программу. Костюмы и музыкальные инструменты для оркестрантов приобретены за счёт средств бюджета.

Александр ДАНИЛИН

ДЯТЛОВО

БЕЗ ДЕЛА ПОСУДОМОЕЧНАЯ МАШИНА ПРОСТОЯЛА 10 ЛЕТ

Козловщинский дом-интернат размещается на территории бывшей помещичьей усадьбы, построенной в начале минувшего века.

Последние шесть десятилетий он используется для социальных нужд как детский дом, затем как пристанище для престарелых и инвалидов, в настоящее время это медико-социальное учреждение для временного и постоянного проживания недееспособных граждан, страдающих хроническими психическими заболеваниями, нуждающихся в уходе, бытовом и медицинском обслуживании.

Дом-интернат, рассчитанный на 136 человек, получил в наследство ветхие деревянные здания с печным отоплением, без водоснабжения и канализации, в комнатах проживает более десяти человек.

В 1990 году из средств республиканского бюджета начато строительство типового дома-интерната, но из-за недостатка средств работы не завершены. Однако консервация здания пищеблока и главного корпуса так и не проведена, что способствует разрушению конструкций, не обеспечена охрана объекта.

В ходе проверки, проведённой Комитетом госконтроля, стали очевидны и другие упущения и недоработки в организации финансово-хозяйственной деятельности дома-интерната. В частности, выяснилось, что не разработано и не утверждалось положение о Козловщинском доме-интернате, не произведена его государственная регистрация. После получения дополнительного участка земли, не оформлен новый акт землепользования. Учреждением даже не получена лицензия на осуществление медицинской деятельности. И, наконец, нанимателем – комитетом по труду и социальной защите Гродненского облисполкома – не заключён контракт с директором дома-интерната.

В соответствии с действующим законодательством проживающим в интернате на условиях государственного обеспечения выплачивается часть пенсии. На 70 человек, не способных самостоятельно распоряжаться деньгами, открыты в филиале банка лицевые счета, на которых без движения находятся денежные средства, а на сберкнижках хранятся деньги ранее проживающих и умерших в доме-интернате людей, которые можно было бы использовать для нужд учреждения.

По различным причинам не используются 7 единиц оборудования общей стоимостью свыше 6 миллионов рублей.

Более десяти лет хранится под открытым небом в упаковке посудомоечная машина, не эксплуатируются также стиральная машина, насос, котёл, компьютеры.

Отсутствие помещений стало причиной неиспользования 7 единиц медицинского оборудования, крайне необходимого для обслуживания больных.

Не обеспечено полное ведение учёта драгоценных металлов, содержащихся в основных средствах и оборудовании, имеют место другие нарушения финансово-хозяйственной деятельности.

По результатам проверки 6 работников дома-интерната, в том числе и директор, привлечены к административной ответственности, 9 человек – к дисциплинарной и материальной ответственности.

По материалам пресс-службы Комитета госконтроля Гродненской области

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ДЗЯТЛАВА

НАШ ГОРАД ПРЫГАЖЭЕ

Як лічаць жыхары Дзятлава, горад увачавідкі прыгажэе.

І сапраўды, апошнім часам пабелены бардзюры, дрэвы, разбіты кветнікі. Добраўпарадкоўваюцца вуліцы Савецкая і Кірава, што прылягаюць да цэнтральнай плошчы. На самой жа плошчы, насупраць прыватнай крамы, будуць разбіты газоны. Мяркуецца, што з цягам часу рух транспарту там будзе забаронены.

"СВЕТ МАІХ ЗАХАПЛЕННЯЎ"

Пад такой назвай у Гродне прайшло свята для дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця.

Дзятлаўскі цэнтр навучання і рэабілітацыі на ім прадстаўлялі Алег Бляк з вёскі Дварэц, Віталік Крэдзіч з пасёлка Гезгалы і Наташа Гародка з Дзятлава.

Алег праспяваў прысутным песню, якая называецца "Дзяцінства". Яна была вельмі цёпла прынята гледачамі. Віталік прадэманстраваў дзве кампазіцыі пад назвай "Гаспадар зямлі" і "Дзяўчынка з сабачкам". Для сваіх работ ён выкарыстаў пластылін і тканіну. Вялікую цікавасць ва ўсіх выклікала і работа Наташы Гародка, якая называецца "Ваза з кветкамі,"— на бардовым плюшы — жоўтыя кветачкі з цеста. А сама паездка ў Гродна і цёплы прыём у Палацы творчасці дзяцей і юнацтва зрабілі на Алега, Віталіка і Наташу вялікае ўражанне.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ГРОДНО

ЗАДЕРЖАНЫ АКТИВИСТЫ АНАРХИСТСКОГО ДВИЖЕНИЯ

С задержания трех активистов движения анархистов начался 1 мая на площади Ленина в Гродно официальный митинг, посвященный Празднику труда.

Дмитрий Дулько, Руслан Парамонов и Александр Василевич, представители незарегистрированной молодежной Конфедерации действующих сообществ "Вместе" (КДС), задержаны милицией и доставлены в Ленинский РОВД сразу, как только они развернули красно-черные анархистские флаги. Дмитрия Дулько и Александра Василевича отпустили через 15 минут после задержания. У них отобрали флаги и переписали паспортные данные. "Нас предупредили, что если мы снова развернем на площади флаги, нам дадут сполна — 15 суток", — сообщил БелаПАН Дмитрий Дулько.


На безработного жителя Минска Руслана Парамонова составили протокол и задержали в РОВД на сутки. 2 мая в суде Ленинского района Гродно над ним должен состояться суд за использование незарегистрированной символики.

Алеся СИДЛЯРЕВИЧ

ПАМЯЦЬ

ТАМ ЗОРКІ ЧЫСТЫЯ, ЯК СЛЁЗЫ, МІГЦЯЦЬ У ЦЁПЛАЙ ЦІШЫНІ

Зямелька родная... У снах і мроях ты жывеш да скону дзён у змучаным сэрцы. Пра цябе хочацца бясконца расказваць дзецям і ўнукам, каб і яны палюбілі гэтак жа шчыра і аддана мілы куточак, які называецца Дзятлавам, а па-яўрэйску — Жэтл. На дзятлаўскай зямлі шмат брацкіх магіл, дзе пахаваны сотні і тысячы ні ў чым не вінаватых людзей — старых, жанчын, дзяцей. Іх забівалі толькі за тое, што яны былі яўрэямі. У час Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія захопнікі пралілі шмат нявіннай крыві гэтага няшчаснага народа. Ён быў працавіты, добры, таленавіты. Мірна жыў у мястэчку разам з беларусамі, палякамі, рускімі, цыганамі.



Першыя дні вайны. 1941 г.

Тыя, каму ў час зверскай бойні ўдалося ўцалець ад фашысцкіх куль і дабрацца да Ізраіля, зрабілі ўсё магчымае дзеля таго, каб іхнія нашчадкі даведаліся пра Дзятлава як мага больш. Напрыклад, Хая Ліпскі і Рыўка Ліпскі (Куфман), дочкі Шабтая Ліпскі, які паходзіць з Дзятлава і страціў сваіх бацькоў у час масавага знішчэння яўрэяў, а таксама страціў і свайго брата, які ў партызанскім атрадзе змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, узялі на сябе святы абавязак напісаць кнігу пра Дзятлава і яўрэяў, якія паходзяць з нашага маленькага гарадка. "Для нас выхадцы з Дзятлава — гэта вялікая сям'я, гэта татавы сябры, што прыходзілі да нас у госці і прыносілі новыя расказы пра далёкі невядомы гарадок, — пішуць сёстры Ліпскі. — Кожны год тата вазіў нас у Тэль-Авіў на сустрэчу з сябрамі маладосці, якім таксама ўдалося выжыць. І ў той час мы ўсе разам успаміналі загінуўшых.

Нягледзячы на тое, што мы ніколі не былі ў Дзятлаве, гэты гарадок стаў для нас родным. І цяпер, калі таты ўжо няма ў жывых, мы ўспамінаем усё тое, што звязана з ім і яго сябрамі, ушаноўваем іх светлую памяць".

Сёстры Ліпскі прыслалі ў Дзятлава некалькі невялічкіх кніжачак, адна з якіх трапіла ў мясцовы гісторыка-краязнаўчы музей, а потым і мне. Яны расказваюць аб тых жудасных падзеях, якія адбываліся на Дзятлаўшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а дакладней, аб знішчэнні фашыстамі яўрэйскага насельніцтва. У канцы чэрвен 1941 года нацысты захапілі Дзятлава, а шостага жніўня 1942 года ў календары ўжо адзначаны як дзень апошняга масавага знішчэння яўрэяў. Забойства нявінных людзей вялося з жудаснай метадычнасцю. Над імі здзекаваліся, прымушалі нашываць шасціканцовую жоўтую зорку на спіне і грудзях. 120 самых паважаных жыхароў Дзятлава нібыта былі вывезены на прымусовыя работы, а літаральна праз два дні іх целы знайшлі ў лесе непадалёку ад Навагрудка. Такім чынам знішчылі людзей, якія маглі б падняць суайчыннікаў на паўстанне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Перш, чым знішчыць яўрэйскае насельніцтва, фашысты рабавалі яго: былі адабраны золата, грошы і іншыя каштоўнасці, што людзі нажылі ў нялёгкай працы на працягу многіх гадоў.

Не мінула дзятлаўскіх яўрэяў і страшнае гета з яго голадам, холадам, думкамі аб немінучай смерці. Аднак трэба адзначыць, што гэтыя мужныя людзі не сядзелі склаўшы рукі і не чакалі далейшага працягу сваёй страшнай долі: яны змагаліся. Дваццаць членаў гета аб'ядналіся ў падпольную арганізацыю на чале з адвакатам Альтэрам Дварэцкім. Гэта арганізацыя авалодала зброяй і рыхтавала паўстанне ў гета. Дзейнічала таксама і арганізацыя "Юдэнрат", якая ставіла на мэце хоць крышку аблегчыць пакуты няшчасных людзей.

Супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Дзятлаве дзейнічала яўрэйскае падполле, у склад якога ўваходзіла 60 чалавек, а некаторыя ўступілі ў партызанскі атрад і там змагаліся з ворагам. Паступова ў лесе ўтварылася рота з маладых яўрэяў, дужых і ўзброеных, большасць з якіх былі ўраджэнцамі Дзятлава. Тут знаходзіліся таксама жыхары Жалудка, Беліцы, Казлоўшчыны, Дварца і Навагрудка. Рускі камандзір Вахонін дапамог у арганізацыі барацьбы. Мужна змагаліся з фашыстамі яўрэі Гершэль Каплінскі, Іона Мядзведскі, Шалом Угольнік і многія іншыя.

У яўрэйскай роце кожны меў пэўную пасаду. Напрыклад, дзяўчаты працавалі, у асноўным, медсёстрамі, кухарамі, а некаторыя нават удзельнічалі ў баях.

Адна з базаў роты размяшчалася ў лясах паміж рэкамі Шчара і Нёман у 16 кіламетрах на захад ад Дзятлава. Побач з партызанскім лагерам быў і сямейны.

Жылі байцы ў палатках і драўляных пабудовах, мелі гаспадарчыя памяшканні для захавання ежы, палявую кухню з катламі і плітамі. Мясцовыя сяляне дапамагалі прадуктамі харчавання і прадметамі хатняга ўжытку.

Партызаны рабілі налёты на нямецкія абозы, якія вывозілі рознае дабро ў Германію.

У Дзятлаве таксама дзейнічала яўрэйская рота, якая нанесла немалую шкоду нямецка-фашысцкім захопнікам. Байцы нападалі на варожых салдат і іх прыслужнікаў.

Многія з тых, хто дапамагаў ворагам знішчаць нявінных людзей, адчулі на сабе сілу гневу яўрэйскай партызанскай роты.

Мэтай байцоў-яўрэяў таксама было знішчэнне фашысцкіх салдат, якія знаходзіліся ў Рудзе-Яварскай, Накрышках і іншых вёсках, а таксама падрыў транспартных камунікацый, узрыў мастоў, мініраванне чыгуначнага палатна, абрыў тэлефонных і тэлеграфных ліній.

Ён яшчэ раз акінуў поглядам мокрыя галавешкі і, накульгваючы на хворую нагу, паволі пакрочыў на вуліцу Лугавую, дзе сельскі Савет, пранікнуўшыся бядой пагарэльца, выдзеліў яму прытулак у драўляным трохкватэрным доме. Ён не мог не заўважыць, як варожа сустрэлі яго новыя суседзі, як ён перашкаджае ім сваім неахайным выглядам, старасцю, хваробамі. Саграваe душу толькі тое, што добрыя людзі з сельсавета прывезлі ложак, матрац, падушку, а таксама посуд, пасцельную бялізну, вопратку. Ёсць у яго цяпер дах над галавой, пенсію атрымлівае. Пражыць можна, каб не калючая, ледзянячая душу варожасць суседзяў. А як хацелася яму пачуць цёплае слова, убачыць ласкавы погляд, бо мала чалавеку трэба, каб палягчэла на душы. А так ён адчувае сябе лішнім, не патрэбным у гэтым доме, дзе людзі зжыліся гадамі. Такое суседства ім не даспадобы.

А было ж некалі і ў яго шчасце. У гады далёкай маладосці Іван Сяргейскі быў у сваёй Сіняўшчыне, што называецца, на віду. Высокі, прыгожы, умеў добра шыць, іграць на гармоніку. Ажаніўся. Нарадзіліся дзеці. І невядома адкуль раптам падкралася псіхічная хвароба. Жонка забрала дзяцей і паехала ў белы свет шукаць шчасця. Ён застаўся адзін на адзін са сваім горам.

Цяжкімі валунамі пакаціліся гады, праведзеныя ў адзіноце. Людзі не цураліся яго, бо нічога дрэннага нікому не рабіў. Вылечыцца канчаткова не меў надзеі. Так і жыў Божай і людской міласцю. І жыў бы, каб не гэты пажар.

Падобна на тое, што новыя суседзі не маюць намеру цярпець у сваім доме Івана Сяргейскага. Суседзі гэтыя — нібыта і нядрэнныя людзі, працавітыя, акуратныя, самі не з вялікай раскошы. Яны Івана на словах шкадуюць, спагадаюць яго бядзе, і ў той жа час адкрыта выжываюць са свайго дома. Хто спрачаецца — суседства старога хворага чалавека, які не ў стане падтрымліваць у чысціні сваё жыллё — не вялікая радасць. Але трэба падумаць і пра тое, куды ж яму падзецца.



— У дом-інтэрнат няхай адпраўляюць, — падрыхтавалі суседзі такую версію. Але ж па медыцынскіх паказаннях ён не належыць да такіх людзей, якіх трэба ізаляваць ад грамадства. Тут такі выпадак, калі павінны лічыцца з жаданнем чалавека. А Іван Сяргейскі не хоча ў дом-інтэрнат. І сілай яго завезці туды ніхто не мае права, гэтак жа як і кожнага з нас.

— Сяргейскі перашкаджае вам? — пытаю ў адной суседкі. — Можа чым крыўдзіць, абражае?

— Ды не, — адказала яна. — Ён як устане на ўзыходзе сонца, то адразу ідзе на сваё пажарышча. Ціхі, маўклівы. Але ж ён стары, хворы, неахайны. Трэба яго ў дом састарэлых. Нам такі сусед не патрэбен. Будзем усюды пісаць, скардзіцца. Няхай забіраюць яго адсюль, куды хочуць.

Вось так. Не больш і не менш. А куды яго забраць? Жывая ж душа, пад плот не выкінеш.

Часта ўспамінаю словы, сказаныя адным разумным чалавекам: ты ведаеш, мне сярод людзей іншы раз бывае страшней, як у цёмным лесе...

Тут якраз такі выпадак.

Не раз думаю, як лёгка быць добрым на словах. Пустыя спачуванні, шкадаванне. Кабеты льюць слёзы, гледзячы пустыя мексіканскія серыялы, а суседа-калеку, што жыве ў адным доме, не шкадуюць. І як лёгка людзі іншы раз распараджаюцца чужым лёсам. І не думаюць пра тое, што не сёння-заўтра ў становішчы Івана Сяргейскага можа аказацца любы з нас, што старасць і хваробы, і пажары, і няшчасце ходзяць па свеце без перапынку. Хто наступны?

Можа і непрыемнае суседства старога бездапаможнага калекі. А хто сказаў, што мы павінны рабіць у жыцці толькі тое, што прыемна? І замест таго, каб дружна ваяваць супраць безабароннага Івана Сяргейскага, суседзям трэба павярнуцца да яго душой.

Я не хачу гаварыць пра міласэрнасць. Гэта слова ў апошні час так зацягалі, што яно пачало губляць свой высакародны сэнс, бо міласэрных учынкаў у нас зусім няшмат. Прашу толькі аб адным: людзі, пабойцеся Бога! Ніхто на гэтым свеце не лішні. А жыццё такое кароткае і такое нетрывалае, як павуцінка на асеннім іржышчы...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

МАСТАЦТВА

БУДЗЕ СВЯТА І НА ЯГО ВУЛІЦЫ

Стаяў цёплы красавіцкі дзень. Вёска Малыя Краглі, што ў Дзятлаўскім раёне, скідала з сябе зімовую самоту: весела шчабяталі на дрэвах вераб'і, пад платамі, на яшчэ сырой зямлі, грэбаліся куры. На сядзібе Дваранінаў, як і ўсюды побач, прыкметна праклёўвалася маладая зялёная траўка. Гаспадар, Іван Міхайлавіч, паіў каля калодзежа карову. Пярэстая рагуля падняла над вядром галаву, раўнадушна глянула на нас ліловымі вачыма і зноў стала піць.

– Я толькі прыйшоў з работы, а дома таксама клопатаў хоць адбаўляй, – прамовіў гаспадар, працягваючы для прывітання руку – моцную, шурпатую ад бясконцых сялянскіх спраў. Быў ён у кірзавых ботах, рабочай вопратцы.


– А дзе вы працуеце? – спытала я, хоць чамусьці была ўпэўнена, што майстар разьбы па дрэву, тым больш, майстар такога высокага класа, займаецца сваёй любімай справай.

– На калгаснай стайні. Конюх у водпуску, дык я яго замяняю. А потым буду замяняць другога...

Ад болю ў мяне сціснулася душа. Ён жа мог бы дзетак вучыць, перадаваць ім сваё майстэрства. А майстэрства ў гэтага чалавека не абы якое. Пасля школы закончыў вучылішча будаўнікоў, адслужыў у арміі і жыў у Мінску, дзе ў тэатральна-мастацкім інстытуце вучыўся брат Арсень – мастак, імя якога вядома ўсёй Еўропе. Іван працаваў, а ў вольны час займаўся разьбой па дрэву. Выдатныя атрымліваліся работы: дасканалыя, акуратныя, выкананыя з вялікім мастацкім густам. Колькі сіл і старання прыкладаў дзеля гэтага малады майстар! З вялікім цярпеннем выпільваў, шліфаваў. І не дзіва, што людзі захапляліся імі.

Аднойчы знаёмая брата, якая таксама вучылася ў тэатральна-мастацкім інстытуце, падказала Івану, што на заводзе "Гарызонт" ёсць бюро эстэтыкі. Майстры, што там працуюць, займаюцца афармленнем памяшканняў, ствараюць у іх прыгажосць. Ён пайшоў і папрасіўся на работу.

Менавіта там, на "Гарызонце" яшчэ больш удасканалілася майстэрства. Там ён пачаў рабіць падстаўкі для кветак, цудоўныя столікі, аздобленыя разьбой. Так бы мовіць, каронны нумар майстра – рамкі для люстэркаў. Вялікія. Дзесьці метр у вышыню і метр у шырыню. Арыгінальныя, дзівосныя, якіх не было ні ў кога. Рэч масіўная, з акуратна адшліфаванымі завіткамі ўзору. У Мінску багатыя людзі куплялі іх па 600 долараў за штуку.



Іван Міхайлавіч (злева) з панам Збігневам Свянціцкім, у якога ён жыў і працаваў

Аднойчы Іван атрымаў заказ на такое люстэрка. Прычым, заказчык сказаў, што мае намер купіць у яго некалькі рэчаў. Майстар быў задаволены. Зрабіў рамку, уставіў у яе люстэрка і на гарадскім транспарце павёз гаспадару. Аўтобус, тралейбус, зноў аўтобус. Замучылі перасадкі, тым больш, што трэба было вельмі пільнавацца, каб не сапсаваць дарагую далікатную рэч. Дарагую ва ўсіх адносінах. І трэба ж здарыцца бядзе: на апошнім прыпынку, калі прыйшоў час выходзіць, вадзіцель рэзка затармазіў, рамка аб нешта стукнулася, і люстэрка лопнула.

Заказчык верыў у забабоны і работу не прыняў: калі разбілася люстэрка, то ў жыцці шанцаваць не будзе. Больш ён у Івана нічога не заказваў.

Майстар, канешне, засмуціўся, але не адчайваўся, бо ведаў, што на яго вырабы попыт знойдзецца. І сапраўды: дзевяць работ Івана Дваранiна набылі ў Германію, восем – у Варшаву. Ёсць яны ў Францыі, Аўстраліі, Амерыцы.

Паўгода Іван Міхайлавіч жыў і працаваў у Варшаве. Тамашні знакаміты архітэктар Збігнеў Свянціцкі пабудаваў сабе трохпавярховы дом па вельмі арыгінальным праекце, а аздабляць яго ў сярэдзіне запрасіў беларускага майстра і застаўся вельмі задаволены яго работай.

Лёс да гэтага чалавека ніколі не быў асабліва ласкавы. Не склалася сямейнае жыццё. Калі памёр бацька, ён пакінуў сталіцу і прыехаў у родную вёску даглядаць старэнькую маму. У яго ёсць яшчэ браты і сястра (адзін – знакаміты мастак, жыве ў Гомелі, другі – будаўнік. Ён з сям'ёй – у Баранавічах. Сястра – сувязіст – у Мінску). Да мамы вярнуўся Іван Міхайлавіч. Прывёз з сабой дзве цудоўныя рамкі, чарцяжы розных вырабаў, што меўся ствараць з дрэва, і праект дома, якога яшчэ няма ні ў кога ў Беларусі. Прывёз сум па любімай справе, бо тут ён не можа па-сапраўднаму займацца разьбой па дрэву: няма належнага абсталявання. Праўда, адзін станок ёсць ёсць, але гэтага недастаткова. Іван Міхайлавіч хоча прасіць старшыню мясцовага калгаса, каб дазволіў яму працаваць у сталярнай майстэрні гаспадаркі і там ствараць свае цудоўныя рэчы. Хоча вучыць майстэрству мясцовых дзетак.

– Мне ўжо пяцьдзесят два гады, – са скрухай прамовіў ён. – Хацелася б перадаць тое, што ўмею, сваім юным землякам, а потым дапамагчы ім паступіць вучыцца далей, знайсці сваё прызванне. Але працаваць з дзецьмі мне не дазволілі, бо не маю педагагічнай адукацыі.

Зноў дзіва-дзіўнае: няважна, што ёсць талент, ёсць шчырае жаданне працаваць, а важна, што няма ў майстра адпаведнай паперкі. Бывае ж і так, што адукацыя ёсць, а таленту няма. Такім працаваць з дзецьмі можна. І як тут не паверыць у тое, што «без бумажки я букашка, а с бумажкой – человек».

Іван Міхайлавіч вельмі інтэлігентны. У яго тонкая і чуллівая душа, заўсёды адкрытая для прыгажосці, а рукі не баяцца ніякай работы. Нягледзячы на тое, што мама не можа працаваць па гаспадарцы, яны трымаюць карову, свіней, курэй, гусей. Ці трэба казаць, што ўвесь цяжар будняў на плячах сына.

Я ведаю гэтага чалавека даўно і пастаянна захапляюся ім. Прыехаць са сталіцы ў глухую лясную вёску, памяняць любімую работу высокакласнага майстра на стайню і пры гэтым не страціць сябе – такое ўдаецца не кожнаму. Іншы б на яго месцы спіўся, апусціў бы рукі, паддаўся адчаю. А ён працуе і верыць, што некалі будзе свята і на яго вуліцы: дапамогуць знайсці месца для майстэрні ці дазволяць працаваць у калгаснай сталярцы, дадуць магчымасць вучыць сваёй справе дзетак.

Свет не без добрых людзей, і хто-небудзь абавязкова адклікнецца.

Мы разам з загадчыкам аддзела культуры Дзятлаўскага райвыканкама Васілём Шыцько і дырэктарам гісторыка-краязнаўчага музея Фёдарам Красюком ездзілі да Івана Дваранiна, каб узяць яго дзівосныя рэчы для выставы, якая будзе ладзіцца ў музеі. Тут знойдуць месца работы і яго брата Арсеня, і многіх таленавітых людзей Дзятлаўшчыны.

У каго будзе магчымасць, абавязкова наведайце яе і парадуйцеся за землякоў, якіх Бог надзяліў вялікім талентам. Будзе магчымасць, абавязкова наведайце яе і парадуйцеся за землякоў, якіх Бог надзяліў вялікім талентам. Упэўнена, што вас глыбока крануць работы цудоўнага чалавека і выдатнага майстра Івана Дваранiна.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

НОВОЕ ИЗДАНИЕ

КНИГА НАШЕГО ЗЕМЛЯКА


Уже на четыре языка переведена книга уроженца Слонима Якова Шепетинского «Приговор» («Военная одиссея узника гетто, партизана, фронтовика, зека». Тель-Авив, 2002 г.).



Вначале её издали в Израиле на иврите, затем в Англии, в Польше, и вот снова в Израиле, но уже на русском языке.

В отличие от многих мемуаров, книга Шепетинского написана самим автором, а не с его слов. В этом читателям не трудно убедиться. Простой житейский язык, «непричёсанные» выражения из армейской или «зековской» жизни... Книга необычна, как необычна судьба её автора.

Начинается она с описания послевоенного сталинского лагеря на Северном Урале, затем автор возвращает нас к началу войны...



По всем законам он должен был погибнуть, но выжил: выжил после расстрела в Чепелёво, выжил в партизанах, выжил на фронте (дошёл до Берлина), выжил в лагерях... Не хотелось бы делать громких сравнений, но что-то общее объединяет его с Павкой Корчагиным и легендарным Алексеем Мересьевым.

До выхода на пенсию инвалид Шепетинский (у него нет стопы) работал армейским фотографом в Израиле. Причём, не кабинетным фотографом, а, как говорится, – полевым.

В судьбе одного человека отразилась судьба целого народа: наших земляков, соседей, друзей детства... Не услышишь больше на Замостье еврейскую флейту или скрипку, никто уже на Замковой не поприветствует тебя радостным «Шалом!», и за праздничным столом у соседа не предложат тост «Лэ Хаим!» – «За жизнь!».

Игорь ПОДГОРОДЕЦКИЙ

P.S. В Израиле собираются снимать фильм по книге «Приговор». Возможно, киногруппа посетит и Слоним.

ГЭТА ЦІКАВА

ЯДВІСЯ ЖЫЛА

НА РУЖАНСКАЙ ВУЛІЦЫ

Сёлета спаўняецца 80 гадоў з таго часу, калі ўпершыню пабачыла свет асобным выданнем аповесць Якуба Коласа "У палескай глушы".

Аповесць да сённяшніх дзён вывучаецца ў школе. І кожны з нас памятае галоўную гераіню аповесці Ядвісю, якая рана страціла бацьку і маці. Ядвіся пакахала настаўніка Андрэя Лабановіча, з якім яе аб'ядноўваў светлы і чысты погляд на жыццё, імкненне да светлай будучыні. Але кожны з іх выбраў свой шлях.

Яшчэ пры жыцці паэт Сяргей Новік-Пяюн некалькі разоў расказваў мне, што коласаўская Ядвіся – гэта нявыдуманая літаратурная гераіня, а рэальная асоба, аб чым ён даведаўся ў Слоніме ў ліпені 1936 года ад слонімскага паэта Гальяша Леўчыка.

Аднойчы Гальяш Леўчык расказаў Сяргею Новіку-Пеюну, што прозвішча ў Ядвісі было Бараноўская, а жыла яна ў доме на ўзгорку насупраць Ружанскіх могілак. У "Нашай ніве" яна час ад часу друкавала свае вершы, падпісваючы іх псеўданімам Юстына.

Сяргей Новік-Пяюн неяк нагадаў мне, што ён нават сустракаўся са спадарыняй Бараноўскай у 1936 годзе: "Аднойчы да мяне падышла высокая, зграбная кабета ў чорным паліто і капелюшы, з-пад якога відаць былі сівыя валасы. Адчувалася, што яна некалі была прыгожай дзяўчынай. Кабета з ветлівай усмешкай прывіталася: "Добры дзень, я – Ядвіся. Так, тая Ядвіся, пра якую напісаў Якуб Колас. Мне пра вас расказваў Гальяш Леўчык. Маё прозвішча па мужу Бараноўская". Да нас падышла дзяўчына. "Гэта мая дачка, настаўніцай працуе", – пазнаёміла нас Бараноўская. На развітанне яна сказала: "Калі ласка, заходзьце да нас. Гальяш даў вам наш адрас".

Прайшло шмат гадоў. Вясною 1961 года Сяргей Новік-Пяюн наведаў Слонім і завітаў у дом, дзе жылі Бараноўскія. Людзі, якія там кватаравалі, сказалі, што спадарыня Бараноўская з дочкамі ў 1945 годзе выехала ў Польшчу.

Сяргей ЧЫГРЫН

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ВЫСЫЛКА

АДАМ СТАНКЕВІЧ У СЛОНІМЕ

Імя беларускага рэлігійнага, палітычнага і культурна-асветніцкага дзеяча, аднаго з заснавальнікаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, рэдактара часопіса "Хрысціянская думка" Адама Станкевіча (1891-1949) паціху вяртаецца з небыцця.



Адам Станкевіч



Касцёл бернардзінак у цэнтры Слоніма, дзе служыў Адам Станкевіч. Фота пачатку XX-га стагоддзя, друкуецца ўпершыню

Ужо надрукаваны яго многія працы, напісаны пра яго артыкулы, успаміны. Да друку рыхтуецца і кніга ягоных твораў.

Да вайны Адам Станкевіч пэўны час жыў у Слоніме і вёў богаслужэнне ў касцёле бернардзінак, які знаходзіцца ў цэнтры горада. А выслалі яго сюды з Вільні за тое, што быў беларускім святаром і вёў службу на беларускай мове.

Так, 27 снежня 1938 года выехалі з Вільні выселеныя з прыгранічнай паласы на пяць гадоў рашэннем віленскага ваяводы кс.Адам Станкевіч, кс.Уладзіслаў Талочка і інжынер Адольф Клімовіч. Уладзіслаў Талочка пасяліўся ў Беластоку, Адольф Клімовіч — у Варшаве, а Адам Станкевіч — у Слоніме. Праўда, ён яшчэ паспеў перад высяленнем выдаць у Вільні кніжку "Беларускі хрысьціянскі рух".

Новы 1939 год ксёндз Адам Станкевіч сустрэў у Слоніме. Акрамя службы ў касцёле бернардзінак (служыў па-польску, па-беларуску польскія ўлады не дазволілі), шмат пісаў на роднай мове, перапісваўся з беларусамі з Вільні, Беластока, Варшавы, Прагі, Мінска, Санкт-Пецярбурга і іншых гарадоў. У Слоніме Адам Станкевіч напісаў вялікую працу "З літуанізмаў у беларускай мове" і надрукаваў яе ў алфавітным парадку ў некалькіх нумарах квартальніка "Калосьсе". Праца гэтая выклікала вялікі рэзананс. Многім яна не падабалася. Так, напрыклад, у газеце "Беларускі фронт"(15.5.39 г., № 10) з'яўляецца вялікі артыкул "Аб "літуанізмах" Адама Станкевіча" нейкага Ш-ць. Ён моцна крытыкуе аўтара, абражае яго, наводзіць паніку і г.д. Прачытаўшы гэта, спадар Станкевіч дасылае са Слоніма ў "Калосьсе" тактоўнае пісьмо-адказ: "Паважаны Грам. Рэдактар, не адмоўце памясціць у "Калосьсі" гэтых некалькі слоў: "Я дужа ўдзячны гр. Ш-ць ("Бел. Фронт" № 10, 15.6.39) за крытычныя і фаховыя ўвагі да маёй працы "З літуанізмаў у беларускай мове"; падчырківаю — за крытычныя й фаховыя, характару языкаведнага, бо-ж, апрача гэтага, чаго там толькі няма!? Але transeat! Мне йдзець аб дасьледжаньне літуанізмаў у беларускай мове й з слушных (а ня ўсе так гэткія!) заўвагаў у гэтай праблеме я ахвотна скарыстаю, калі праца мая будзе выходзіць асобнай адбіткай. Тады выкажу такжа свой пагляд і што да тых заўвагаў гр.Ш-ць, з якімі я не згаджаюся.

Прыміце, Гр. Рэдактар, словы маёй да Вас пашаны. Ад. Станкевіч. Слонім, 17.5.39 г.".

Жывучы ў Слоніме, Адам Станкевіч пільна сочыць за выхадам новых беларускіх кніг. 27 красавіка 1939 года ён піша грунтоўную рэцэнзію на кніжку беларускага паэта і даследчыка Хведара Ільяшэвіча"Друкарня дома Мамонічаў у Вільні (1575-1622)" і друкуе яе ў часопісе "Калосьсе" (1939, № 2). Крытык спыняецца на кожным з пяці раздзелаў працы Хведара Ільяшэвіча, указвае на іх каштоўнасць і значэнне. "Кніжка Хв.Ільяшэвіча, — адзначае А. Станкевіч, — гэта значны ўклад у маладую беларускую навуку. Агульнай, аднак, нястачай кніжкі зьяўляецца нявыразны не воблік беларускі. Мамонічы — гэта беларускія патрыёты й беларускія культурнікі, й кніжкі іх прызначаны для беларускага народу. Тымчасам гэта ў Хв.І. ня толькі што з націскам не адзначана, але нават як-бы сарамліва прыхавана пад бліжэй неазначанымі тэрмінамі: "Русь, рускі, патрыёт, Вял. Кн. Літоўскае" і інш. Я разумею, што да гэткай "сарамлівасьці", што да беларускасьці прымушалі аўтара абставіны, у якіх праца была пісана й выдана. Затое цяпер аўтар павінен сваю цэнную працу перакладзіць на беларускі язык, паставіць "беларускія точкі" над усімі "і", раскрыць усе "дужкі", паставіць , дзе трэба, "беларускія націкі" і... па-беларуску выдаць. Але хто выдасьць? Гэтая кніжка мусіць праявіць сваю беларускую "душу" й мусіць прыадзецца ў сваю беларускую "вопрадку".

За слонімскі перыяд жыцця кс. Адамам Станкевічам было напісана яшчэ шэраг артыкулаў і рэцэнзій.Тут, у Слоніме, ён дапамог мясцоваму паэту Анатолю Іверсу (Івану Міско) наладзіць сувязі з Вільняй наконт выдання яго першага паэтычнага зборніка "Песьні на загонах". Пра гэта пры жыцці не раз расказваў мне наш старэйшы паэт. Яны сустрэліся ў Слоніме ў 1939 годзе. І была на гэта нагода. Выдавецтва "Калосьсе" рыхтавала да друку зборнік вершаў Анатоля Іверса "Песьні на загонах". Рэдактар выдавецтва Ян Шутовіч, ведаючы, што паліцыя на вёсцы правярае, а часам і забірае карэспандэнцыю, карэктурныя лісткі зборніка прыслаў у касцёл у Слонім Адаму Станкевічу, а паэту напісаў пісьмо, каб той абавязкова зайшоў да ксяндза, што Іверс і зрабіў.

Гаспадар доміка, які знаходзіўся на касцельнай тэрыторыі, сустрэў слонімскага паэта ў сваім пакоі па-хатняму, без сутаны:

— Ведаю, ведаю пра вас. Вось карэктура вашай кнігі, уважліва прачытайце і зрабіце папраўкі, калі знойдзеце памылкі.

Малады Анатоль Іверс усхваляваўся, убачыўшы надрукаваныя на лістках свае вершы. Вочы сталі вільготнымі, і ён хутчэй па памяці, чым зрокава, пачаў чытаць вершаваныя радкі. Сям-там на палях ужо былі вынаскі літар, зробленыя Адамам Станкевічам. Першы раз слонімскі паэт спасцігаў карэктарную мудрасць і, бадай, не знайшоў ні адной незаўважанай і не папраўленай памылкова набранай у тэксце літары.

Пасля яны яшчэ доўга гутарылі, а напрыканцы сустрэчы Адам Станкевіч спытаў, ці надакучвае паліцыя.

— Яшчэ як дакучае, — сказаў Іверс, — лазіць па пятах, забірае з паштовага агенцтва беларускія і ўкраінскія газеты. Арыштоўвае хлопцаў перад святамі, рэдка абыходзіцца без катаванняў у дэфензіве. Забараняе ставіць беларускія спектаклі...

— Вось што, браток, не трэба лезці на ражон, — параіў Адам Вікенцьевіч. — Хоць, праўда, і я не ўсцярогся, бачыце, саслалі з Вільні ў Слонім. І тут не дазволілі ў касцёле праводзіць службу на беларускай мове...

На развітанне Адам Станкевіч запрасіў слонімскага паэта заходзіць часцей. Але больш ім сустрэцца не ўдалося, хоць пражыў ён у горадзе над Шчарай амаль год.

На працягу года Адаму Станкевічу і Адольфу Клімовічу з Варшавы адзін раз усё ж дазволілі наведаць Вільню. Гэта адбылося ў 1939 годзе на Велікодныя святы. А восенню таго ж года са Слонімам Адам Станкевіч развітаўся назаўсёды.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДУХОЎНЫ СКАРБ

500 ГАДОЎ НАЗАД У ЖЫРОВІЧАХ БЫЛА НАПІСАНА ПЕРШАЯ КНІГА



Бібліятэкар Наталля Цімашова знаёміць з экспанатамі музея

Аб гэтым нашы карэспандэнты даведаліся, калі пабывалі ў музеі беларускай кнігі пры Слонімскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Якуба Коласа.

Адзінаццаць гадоў назад намаганнямі супрацоўнікаў гэтай бібліятэкі быў створаны першы на Гродзеншчыне музей беларускай кнігі.

Нядаўна цікавую экскурсію па двух аддзелах музея для нас правяла бібліятэкар Наталля Цімашова. З яе слоў мы даведаліся, што яшчэ ў XV стагоддзі ў Жыровіцкім манастыры было напісана "Жыровіцкае евангелле" і прыгожа аздоблена застаўкамі і мініяцюрамі. А ў XVII стагоддзі жыровіцкі манах Феадосій Баравік напісаў свае творы на ўзорнай беларускай літаратурнай мове. Яны так і называліся — "Аб абразах, аб рэліквіях" і г.д.

Друкаваліся кнігі ў друкарні Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме на польскай і італьянскай мовах...

Імя Якуба Коласа было нададзена бібліятэцы ў 1954 годзе. Праўда, сам Якуб Колас ніколі на Слонімшчыне не быў. Тым не менш, яму прысвечаны першы аддзел музея беларускай кнігі ў бібліятэцы.

Там сабраны розныя выданні народнага песняра, альбомы, ёсць і вельмі каштоўная кніга Якуба Коласа "Адшчапенец" з аўтографам пісьменніка для Слонімскай бібліятэкі.

Акрамя Якуба Коласа ў музеі бібліятэкі захоўваюцца кнігі з аўтографамі Петруся Броўкі, Ніла Гілевіча, Алега Лойкі, Уладзіміра Арлова і іншых літаратараў.

Другі аддзел музея прысвечаны літаратурнай Слонімшчыне. Ён расказвае пра жыццёвы і творчы лёс нашых пісьменнікаў-землякоў Гальяша Леўчыка, Сяргея Дарожнага, Кандрата Лейкі, Валянціна Таўлая, Анатоля Іверса, Алеся Сучка і іншых.

Акрамя кніг нашых землякоў, там экспануюцца партрэты пісьменнікаў, здымкі, буклеты. Скульптар Леанід Богдан падараваў для музея бюсты Францыска Скарыны і Анатоля Іверса.

Музей беларускай кнігі ў Слонімскай цэнтральнай бібліятэцы — гэта пакуль адзінае месца на Слонімшчыне, дзе ўшаноўваецца памяць пра літаратараў нашага краю.

Сяргей ЧЫГРЫН

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ЛЕГКАЯ АТЛЕТИКА

МОЖНО КОМПЛЕКТОВАТЬ СБОРНУЮ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

Удачно выступили на областной спартакиаде школьников среди ДЮСШ спортсмены детско-юношеской спортивной школы № 3 г. Слонима. Среди двадцати четырех команд наши ребята заняли второе общекомандное место, пропустив вперед только гродненских спортсменов.



Спортсмены ДЮСШ №3

В соревнованиях приняли участие юноши и девушки 1986-87 и 1988-89 годов рождения. В копилку слонимской команды легли 10 первых мест, 6 — вторых и 5 — третьих.

Из числа слонимских спортсменов 1988-89 г.р. на пьедестале почета побывали все. Татьяна Лугина опередила всех соперниц на 100-метровке (результат 12,4 сек) и на дистанции 200 метров (26,1 сек). Инна Борисик первенствовала на 3 000 метров (11.06,8 сек). Инна Семенова бегала дистанции с барьерами. На 100-метровке она вышла победительницей (17,3 сек), а на 300-метровке финишировала второй(49,6 сек).

В тройном прыжке не было равных Наталье Алешиной (10,59 м). В прыжках в длину она стала второй (4,88 м). Илья Молчанов дальше всех толкнул ядро (14,09 м) и показал второй результат в метании диска (34,64 м). В беге на 60 метров с барьерами победил Илья Рыжевич (9,1 сек). На дистанции 300 метров с барьерами он был третьим (45,1 сек).

Среди ребят 1988-89 г.р. первыми становились Василий Адамчик — в толкании ядра (15,75 м) и метании диска (48,09 м), а также Наталья Кацар в беге на 200 метров (25,6 сек). Она же была второй на 400-метровке (58,4 сек). Второй результат показал и Сергей Шлемин на дистанции 60 метров с барьерами (8,5 сек). Сергей Романюк стал третьим в беге на 400 метров с барьерами (1.02,8 сек).

К сожалению, травма помешала закончить соревнования бронзовому призеру зимнего первенства Республики Беларусь Эдгару Багдасаряну.

В семиборье нашу команду представляла Елена Кречик. После шести видов программы она лидировала в личном зачете, но, неудачно исполнив три попытки прыжков в длину, стала только второй, набрав 3110 очков.

Кроме того, в личном первенстве выступили еще восемь воспитанников ДЮСШ № 3. Среди них третьими стали: Светлана Куликовская на 100-метровке (13,2 сек), Павел Мартьянов в метании копья (36,48 м) и Дмитрий Туровинов, который прыгнул в длину с результатом 5,94 м и совершил тройной прыжок на 12,77 м.

Готовили ребят к соревнованиям тренеры В. Беляев, А. Блошко, В. Яговдик и О. Шевченко.

С 12 по 15 мая в Гомеле пройдет республиканская спартакиада среди спрортивных школ. В команду Гродненской области вошли Наталья Кацар и Василий Адамчик. Что касается ребят 1988-89 г.р., то, по мнению тренеров, в сборную области, скорее всего, будут включены все наши спортсмены, участвовавшие в спартакиаде.

Александр ЗАХАРЕНКО

ЧЕСТВОВАНИЕ

ПОДАРКИ ДЛЯ ВЕТЕРАНОВ СПОРТИВНОЙ ЖУРНАЛИСТИКИ

По случаю Дня печати 5 мая в Минске прошло чествование ветеранов белорусской спортивной журналистики.

Организатором торжественного вечера выступила Белорусская ассоциация спортивной прессы (БАСП) при участии компании "Кока-кола", ПО "Витязь", торгового дома "Керамин", Барановичского станкостроительного завода, ООО "Раковский бровар" и других.

Цветы, сувениры и материальную помощь получили известные в прошлом и ныне работающие ветераны спортивной прессы — Владимир Иванов, Нина Прокопович, Юрий Волошин, Александр Осипенко, Лариса Изотова, Юрий Гершанович, Вольдемар Прецкайло. Подарки получили также молодые, но уже заявившие о себе журналисты.

Награды вручали известные белорусские спортсмены и тренеры — Валерий Певницкий (главный тренер женской сборной страны по гандболу), Виктор Дойлидов (главный тренер мужской сборной по спортивной гимнастике), Михаил Вергеенко (чемпион СССР 1982 года по футболу, первый вице-президент Белорусской федерации футбола) и другие.

Как заявил БелаПАН президент БАСП Петр Рябухин, это мероприятие должно стать традиционным. "Мы должны не забывать ветеранов, ценить их опыт и житейскую мудрость. Кроме того, спортивные федерации посчитали нужным отметить журналистов, которые, по их мнению, лучше других освещают конкретный вид спорта", — отметил П.Рябухин.

БелаПАН

ПРЕДСТАВЛЯЕМ СОПЕРНИКА

ВЕТЕРАН ОБЛАСТНОГО ФУТБОЛА

«КОММУНАЛЬНИК» — «ЛИДА»

10 мая (суббота). Слоним. Стадион «Юность». Начало в 16.00.

Баланс встреч: +1=3-2, мячи 8:7. (в Слониме — +1=2-0, мячи 7:3).

Лучшие бомбардиры: Воронцов, Цыганенко – по 2 мяча; Сафронов – 2.

Футбольный клуб «Лида» (ранее – «Обувщик») основан в 1962 г. В национальных первенствах Беларуси играет с 1992 г.

В I лиге с 1993/94 г.(кроме 1994/95, 1995, 1996, 1999, 2000). В 148 матчах +87=27-34, мячи 242:132. Лучшее место – 1-е(1993/94,1998); худшее — 9-е(2001). В прошлом году «Лида» отметила свой 40-летний юбилей.

Команду возглавляют ее бывшие игроки — главный тренер Виталий Рашкевич (8.10.70) и играющий тренер Сергей Петрушевский (32 года; сыграл 137 матчей в лиге, забил 22 гола).

Костяк команды из опытных и молодых футболистов практически сохранился. Это вратарь Максим Лычев (28 лет; 68 матчей, пропустил 68 мячей), полевые игроки Сергей Сальго (29; 88, забил 7 голов), Дмитрий Сафронов (24; 56, 10), Юрий Каратай (20; 43, 4), Александр Матюк (19; 40, 2), Юрий Ходыко (19; 30, 0), Александр Третьяк (19; 38, 8), Андрей Клыбик (19; 24, 0), Руслан Камейша (21; 23, 1), Валерий Жуковский (18; 16, 1), Андрей Якимович (17; 16, 2).

Клуб усилили Егор Азява (20; 7, 0) и Дмитрий Парфенов (23; 71, 10) из минского «Локомотива», дебютанты чемпионата Артем Бурдыко(20; 2, 0), Александр Татарников (16; 1, 0), 18-летний Андрей Шор и 16-летние Евгений Евтух и Сергей Шостак.

Александр ЗАХАРЕНКО

ГАНДБОЛ

МЕЧТА НЕ СБЫЛАСЬ

С 28 по 30 апреля в Гродно проходила спартакиада учащейся молодежи области. В соревнованиях приняли участие 8 команд девушек 1988-89 годов рождения нашего региона.

Команды были разбиты на две подгруппы. В сильнейшую, группу «А», вошли гандболистки Слонима, Ошмян, Кореличи и Зельвы. Наши девочки выиграли у зельвенских спортсменок 17:8, у ошмянских — 21:16 (хотя проигрывали в первом тайме 5 мячей) и в упорной борьбе уступили кореличским гандболисткам — 10:12. В итоге, только второе место в группе.

Напряженно проходила игра за 3-4 места, где наши землячки встречались с командой Гродно. Увы, победа досталась представительницам областного центра —8:7. И наши спортсменки довольствовались только итоговым четвертым местом. Хотя, по словам тренера слонимских девчонок В.Рисика, команда была в хорошей форме и планировала стать победительницей спартакиады. Что ж, мечта не сбылась.

В нашей команде выделялись Дарья Герасименко (гимназия № 1), Юля Гарбар (СШ № 2), Вика Юрчак (гимназия № 1) и Рита Ефимик (СШ № 5).

А победителями стали гандболистки Ошмян, в финале переигравшие команду Волковыска.

Александр ЗАХАРЕНКО

ХОККЕЙ

СБОРНАЯ БЕЛАРУСИ ПОКИНУЛА ЭЛИТУ МИРОВОГО ХОККЕЯ

Национальная сборная Беларуси покидает элиту мирового хоккея, куда вернулась в прошлом году.

3 мая во втором матче турнира за 13—16-е места подопечные Владимира Крикунова проиграли команде США со счетом 2:4 (2:2, 0:2, 0:0) и вне зависимости от исхода заключительной встречи с хоккеистами Словении 5 мая выбывают во второй дивизион чемпионата мира.

На 6-й минуте счет открыл Тед Друри. На 9-й минуте Владимир Цыплаков (в большинстве) и на 11-й минуте Алексей Страхов вывели белорусскую сборную вперед. Но это был последний успех белорусов. На 20-й минуте Джон Пол, на 30-й Джордан Леопольд и на 40-й Адам Холл обеспечили своей команде победу, при этом все три шайбы американцы забросили в большинстве (первую — с преимуществом в два игрока). Помимо сборной США, прописку в мировой хоккейной элите сохранили японцы, которым до 2004 года место в высшем дивизионе гарантировано Международной федерацией хоккея.

Руслан БАТЕНКОВ

ТЕННИС

УИМБЛДОН КАК СРЕДСТВО ОБОГАЩЕНИЯ

Организаторы Уимблдонского турнира объявили об увеличении суммы призовых в одиночных соревнованиях на 9,5%.

Так, победитель мужского турнира получит 575 тысяч фунтов, что на 50 тысяч больше, чем год назад. В свою очередь, сильнейшая у женщин заработает 535 тысяч фунтов — здесь увеличение составило 49 тысяч.

Впрочем, даже вылет в первом круге турнира, с точки зрения обывателя, оплачивается очень неплохо — 8630 фунтов у мужчин и 6900 — у женщин.

Reuters

ФУТБОЛ

ЖОДИНСКОЕ "ТОРПЕДО" ЛИДИРУЕТ ПОСЛЕ ТРЕХ ТУРОВ

После матчей третьего тура чемпионата Беларуси по футболу среди команд высшей лиги лидирует жодинское «Торпедо».

А результаты матчей следующие: "Локомотив" (Минск) — "Торпедо-СКА" (Минск) — 0:1 (Разин, 25), "Динамо" (Минск) — "Белшина" (Бобруйск) — 1:3 (М.Цыгалко, 14 — Денисеня, 1, Борисик, 22, В.Ковальчук, 65), "Гомель" — "Молодечно-2000" — 0:0, "Звезда-ВА-БГУ" (Минск) — БАТЭ (Борисов) — 0:3 (Стрипейкис, 42, 88, Лошанков, 71), "Торпедо" (Жодино) — "Дарида" (Ждановичи) — 3:1 (Мархель, 22, 69, Трухов, 32 — Журавель, 75), "Нафтан" (Новополоцк) — "Днепр-Трансмаш" (Могилев) — 2:1 (Апанас, 40, Мирончик, 77 — Пищур, 4), "Славия" (Мозырь) — "Неман" (Гродно) — 1:0 (Мартинович, 66), "Шахтер" (Солигорск) — "Динамо" (Брест) — 5:0 (Будаев, 58, Тихончик, 71, Колоцей, 81, Беспанский, 82, Никифоренко, 90).

Единоличным лидером остается жодинское "Торпедо", на счету которого 9 очков из 9 возможных. Далее следуют "Нафтан" — 7, БАТЭ, "Торпедо-СКА", "Гомель" — по 5, "Шахтер", "Динамо" (Мн), "Белшина", "Локомотив", "Молодечно-2000" — по 4, "Днепр-Трансмаш", "Славия", "Динамо" (Бр) — по 3, "Неман" — 2, "Дарида" и "Звезда-ВА-БГУ" — по 1.

Список бомбардиров возглавляет Юрий Мархель из "Торпедо" (Жодино), на счету которого 4 мяча. На втором месте с 3 мячами Максим Цыгалко из минского "Динамо".

Дмитрий ВЛАСОВ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ФУТБОЛ

ТРИ МЯЧА – В ТРЕТЬЕМ ТУРЕ


Даже сильный ливень не мешал мостовским болельщикам ликовать после каждого забитого гола


Неудавшаяся атака "Коммунальника"


Председатели Мостовского и Слонимского райисполкомов: Александр Киселёв (слева) и Мечислав Костюк


Двое мостовчан отобрали мяч у Оначенко

"НЕМАН" — "КОММУНАЛЬНИК" — 2:1

3 мая. Мосты.
Стадион "Неман".
Судья: В. Петрович (Минск).

Удары по воротам:
18 (7+11) – 19 (7+12).
Удары в створ ворот:
10 (4+6) – 8 (3+5).
Угловые:
8 (3+5) – 10 (5+5).
Офсайды:
2 (1+1) – 1 (1+0).
Голы:
29 (17+12) – 14 (10+4).
Предупреждения:
3 – 3.


Атака у ворот слонимской команды

■ **Александр ЗАХАРЕНКО**
Виталий ГИЛЬ (фото)

Как и ожидалось, игра началась с атак хозяев поля. Мостовчане играли более самоотверженно и при потере не гнушались грубой игрой в отборе мяча. Для слонимчан такая игра соперника стала неожиданностью.

Первый гол в ворота «Коммунальника» не стал результатом осмысленных действий игроков «Немана».

Мяч после безобидного навеса с фланга завис над вратарской, где должен был стать легкой добычей голкипера Канашевича. Однако порыв ветра дезориентировал вратаря, который только в последний момент пытался перевести мяч на угловой. «Пятнистый» попал в перекладину и отскочил в поле, где нападающий мостовчан головой переправил его в ворота. Второй гол был забит после того, как игрок «Немана» опередил всех на подборе у штрафной «Коммунальника» и пробил по воротам. Мяч попал в защитника и рикошетом влетел в ворота. Канашевич был бессилен. Стоит отметить, что безвольно сыграл Алексей Тищенко. Не дорабатывали в обороне полузащитники Остапчик и Оначенко.

Во втором тайме тренер слонимчан заменил трех полузащитников и изменил схему игры футболистов обороны. Осипенко сдвинулся влево, Горбач выдвинулся вперед, задним защитником стал Плют. Вольский опустился чуть ниже, а его место занял Срибненко.

Игра "Коммунальника" оживилась, он буквально насел на ворота мостовчан. Но хозяева очень опасно контратаковали. На 65-й минуте гости сократили разрыв в счете. В результате очередной атаки слонимчан капитан хозяев Коцко головой скидывал мяч своему голкиперу, но он перелетел через ветерана "Немана" и оказался в сетке...

На 88-й минуте Цыганенко упускает самый реальный шанс сравнять счет. Вначале он бьет в штангу, а затем повторным ударом попадает прямо во вратаря. Было чего Валерию схватиться за голову.

А уже в добавленное арбитром время в ходе очередной контратаки неманцы увеличили разрыв в счете. ■

МИНИ-ФУТБОЛ

"СЛОНИМСКАЯ ВЕСНА-2003"

В Слониме с 22 апреля по 2 мая проходил турнир по мини-футболу "Слонимская весна- 2003", в котором приняли участие следующие коллективы: СКБЗ "Альбертин", и.п. Ложечников, "Телкон", МЧС, "Белтрансгаз – ДЮСШ", "Динамо", колхоз им. Дзержинского.



Соревнования проходили по круговой системе, каждый играл с каждым. Игры отличались особым упорством, и судьба первого места решалась только в последнем поединке между "Телкон" и "Белтрансгаз-ДЮСШ", где первых устраивала и ничья. Напряженный и красивый поединок закончился победой "Белтрансгаз-ДЮСШ" со счетом 4:1. Лучшими в этом поединке следует признать Николая Дыма, который в переломный момент игры забил два мяча, а также Алексея Баля, Евгения Савоня. Они сыграли как в лучшие свои спортивные годы, когда выступали за ФК "Коммунальник". Третьим призером турнира стала команда "Динамо".

Главным итогом турнира стало то, что он вызвал большой интерес у болельщиков и доставил огромное удовольствие участникам. По их словам, соревнования были организованы на хорошем уровне. Все считают, что турнир должен стать традиционным.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

СЕМ АСАБІСТЫХ ПЕРАМОГ І... ТОЛЬКІ 5-Е КАМАНДНАЕ МЕСЦА

На традыцыйнай абласной спартакіядзе школьнікаў па лёгкай атлетыцы сярод дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, якая прайшла 28–29 красавіка ў Гродне, выхаванцы Слонімскай раённай СДЮШАР занялі пятае агульнакамандное месца.

Вышэй за спартсменаў Слонімскага раёна размясціліся легкаатлеты 1986-87 і 1988-89 гадоў нараджэння з Гродна, Слоніма, Смаргоні і Ваўкавыска. Тым не менш, асабістыя вынікі хлопцаў і дзяўчат з раённай СДЮШАР давалі ім надзею на больш высокае месца ў камандным заліку.

Так, Ірына Іскрык (Парэчча) перамагла ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі (14,9 сек.), а ў скачках у даўжыню была першай з вынікам 5 м 93 см (рэкорд Слонімскай раённай СДЮШАР). Таццяна Цімафейчык (Жыровічы) заняла першае месца ў кіданні молата (52 м 12 см).

У гэтым жа відзе праграмы сярод хлопцаў перамог Дзяніс Кажамяка (Мяльканавічы) і выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту з вынікам 66,20 метраў.

На вышыні аказаліся і шылавіцкія спартсмены. Марыя Сучко ў спартыўнай хадзьбе на 3 000 метраў заняла другое месца, а на 5-кіламетровай дыстанцыі перамагла. Крысціна Гурская пераможцай 5-кіламетровай... Крысціна Гурская першынствавала з вынікам 58,2 сек. на 400-мятроўцы, а ў бегу на 200 м паказала чацвёрты вынік. Крыху горш выступіла шылавіцкая бягуння Вольга Грыпіч. Яна была другой на 400 м (1,03.7 сек.) і чацвёртай на дыстанцыі 300 метраў з бар'ерамі.

Двойчы другім (на 400 м і 800 м) быў навадзевяткавец Сяргей Чайкоўскі. А вось яго аднавясковец Аляксандр Бароўскі на дыстанцыі 2 000 метраў з перашкодамі прыйшоў да фінішу толькі трэцім. У тройку ж прызёраў (трэція месцы) патрапілі Насця Кішкель з Сялявіч (400 м) і Таня Жукоўская (на 800 м і 1 500 м). Двойчы ўзнімаўся на п'едэстал гонару Аляксей Лабко з Дзераўной. Ён перамог у скачках у вышыню (1 м 70 см) і паказаў другі вынік (5 м 55 см) у скачках у даўжыню.

Нядрэнна выступіла на спартакіядзе Ірына Осіпава (Дзераўная). Тры тысячы метраў яна пераадолела другой, а паўтаракіламетроўку — чацвёртай.

Як бачым, легкаатлеты Слонімскага раёна паказалі неблагія асабістыя вынікі. А падрыхтавалі спартсменаў да спаборніцтваў трэнеры раённай СДЮШАР Вера Гурская, Дзмітрый Блізнюк, Рыгор Закаўрас, Пётр Саўко, Ігар Сяркевіч і Сяргей Дзямідзік.

Валерый КАВАЛЕНКА

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

СВЯТА

УЧОРА БЫЛА РАДАЎНІЦА

Тысячы слонімцаў прыйшлі на Радаўніцу, 6 траўня, на магілы сваіх родных і блізкіх людзей.

Як падае Беларуская энцыклапедыя, памінальны абрад адбываецца ў аўторак пасля велікоднага тыдня. Родзічаў спачатку памінаюць у царкве, потым — на могілках, дзе прыбіраюць магілы родных і блізкіх памерлых, рассцілаюць на насыпах абрусы для памінальнай трапезы, якая нагадвае старажытную язычніцкую трызну.



Фота Віталя ГІЛЯ



Фота Віталя ГІЛЯ

Пачалася падпіска на "Газету Слонімскую" на 2-е паўгоддзе.

Падпісацца на яе можна ў любым паштовым аддзяленні Беларусі.

КОШТ ПАДПІСКІ:
На месяц — **2160** руб.
На квартал — **6480** руб.
На паўгоддзе — **12960** руб.

Жыхары Слоніма могуць таксама аформіць падпіску і ў рэдакцыі нашай газеты (Слонім, вул.Камсамольская, 8).
Да 14 траўня можна падпісацца па старому кошту:

КОШТ ПАДПІСКІ:
На месяц — **1860** руб.
На квартал — **5580** руб.
На паўгоддзе — **11600** руб.

Пазваніце па тэлефоне 2-14-39, і наш паштальён завітае да вас дамоў і аформіць падпіску



ГОРОД: НАШИ ЛЮДИ



Фота Віталя ГІЛЯ



Фота Віталя ГІЛЯ

Газета Слонімская

Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар ВАЛАДАШЧУК

ВЫДАВЕЦ
УП "ГАЗЕТА СЛОНІМСКАЯ"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК

НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА Сяргей ЧЫГРЫН

АДКАЗНЫ САКРАТАР Мікола КАНАНОВІЧ

ЖУРНАЛІСТЫ Вольга ШЫНКЕВІЧ, Валерый КАВАЛЕНКА

ФОТАКАРЭСПАНДЭНТ Віталь ГІЛЬ

РЭКЛАМНЫ АГЕНТ Андрэй ЕРАМЕЙЧЫК

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР Аляўціна СІДАРАВА

БУХГАЛТАР Ганна ВАРАНОВІЧ

ВЁРСТКА І ДЫЗАЙН Аляксей ГАРАЙНАЎ, Сяргей КОПАЦЬ

КАРЭКТАР Галіна КЛІНЦЭВІЧ

АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ І РАСПАЎСЮДЖВАННЯ
Загадчык: Анатоль ВАЛАДАШЧУК

Тэлефоны рэдакцыі:
2-14-39,
2-49-39,
4-79-34

Наш адрас:
231800, г.Слонім,
вул. Камсамольская, 8.

e-mail: gs@promedia.by
http://gs.promedia.by

ГРАФІК ПРЫЁМА РЭКЛАМЫ:

Панядзелак - пятніца
з 9^{00} да 18^{00};
Нядзеля
з 11^{00} да 16^{00}
Выхадны — субота

Апошні тэрмін падачы рэкламы ў чарговы нумар і ўнясенне змяненняў у рэкламу
Панядзелак — 18^{00}

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая

(К) Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Падпісана да друку
6 траўня 2003г.
Час падпісання 18:00.
Заказ № **1505**

Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня",
г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.
Аб'ём — сем друкаваных аркушаў

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017